

РЭАЛЬНАЕ РАШЭННЕ ІНТЭРНЭТ-КАНФЛІКТАЎ

Сямейная газета

ДЗЕ СУСТРЭНЕШ СТАРАСЦЬ

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІПЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 133 (30013)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛЕШЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Цяпер масава ўбіраем азімы ячмень. Адзінкавыя сельгасарганізацыі рэгіёнаў паціху пачынаюць уборку азімай пшаніцы, ёсць невялікія плошчы сабранага азімага рапсу. У сувязі з гэтым гаварыць глабальна аб уборачных работах пакуль рана. Папярэдне плануем пачаць масавую ўборку збожжавых культур і рапсу 18—20 ліпеня. Выпадзенне ападкаў нівеліравала складаную сітуацыю на палях, і вільгацезабеспячэнне глеб палепшылася. Ідзе інтэнсіўны наліў зерня ў пшаніцы, трыцікале і жыта. У ячменю назіраецца васковая спеласць, і павелічэнне ўраджаю за кошт наліву збожжа ўжо не адбываецца. Пры гэтым пасевы рапсу яшчэ зялёныя, што сведчыць аб працэсе павелічэння масы збожжавых. Гэта не можа нас не радаваць».*

# ТАМ, ДЗЕ ПРЫХОДЗІЦЬ НАТХНЕННЕ



Купалава Вязынка сваёй атмасферай прываблівае не толькі прыхільнікаў творчасці песняра, але і аматараў спорту на свежым паветры. Напрыклад, дзяўчаты, якіх удалося сфатаграфаваць, займаліся тут ёгай. Па іх словах, гэта месца мае моцную энергетыку. З раніцы яны правялі занятак на беразе вадаёма, а пасля сплялі вянкі з палявых кветак і паселі на дрэве над вадой. Атрымалася вельмі прыгожа. Купалу б, напэўна, спадабалася.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **У 90 раёнах Беларусі ўведзены абмежаванні на наведванне лясоў.**
- Прадпрыемствы «Беллеспаперапрама» нарасцілі экспарт у Свярдлоўскую вобласць больш як на 40 працэнтаў.
- **Маларыцкі кансервавагароднінасушыльны камбінат плануе нарыхтаваць 20 т чарніц.**
- Металургі Расіі і Беларусі на палях «ІНАПРА-Ма» заключылі пагадненні на 4,6 млрд расійскіх рублёў.


ISSN 1990 — 763X


ПаБАЗАРым

# У рытмах фестывалю



**Сёння над Сінявокай 32-гі раз загучаць пераззвоны Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Але горад на Дзвіне жыве форумам ужо некалькі дзён. Мы даведаліся, што цікавага падрыхтавалі для жыхароў і гасцей паўночнай сталіцы напярэдадні свята.**

Уверцюрай свята стаў V Міжнародны танцавальны праект Dream Dance Fest, дзе сваё мастацтва прадэманстравалі некалькі соцень танцораў з розных краін свету. Упершыню ў Беларусі выступаў народны ансамбль «Эдэльвейс» з Рэспублікі Узбекістан, які прадставіў традыцыйны ўзбекскі танец «Андыжанская палітра». Яркае выступленне пад жывое суправаджэнне музыкантаў, якія гралі на народным інструменце дойры, каларытныя касцюмы нікога не пакінулі абыякавым.


СТАР. 3


Спецыяльны рэпартаж

# «Спадарожнік» для жыцця: чым Фаніпаль прыцягвае мінчан

**За апошнія гады гарады ў радыусе 30 кіламетраў ад сталіцы добра і сур'ёзна папрацавалі над сабой: забудавалі пусткі, адкрылі новыя крамы, палепшылі інфраструктуру. Карэспандэнт «Звязды» наведаў Фаніпаль, які па праве лічыцца адным з самых маладых і перспектыўных гарадоў-спадарожнікаў Мінска.**




Населены пункт знаходзіцца за 24 кіламетры на паўднёвы захад ад сталіцы па чыгуначнай і аўтамабільнай магістралях Брэст — Масква. Ён размешчаны на водападзеле рэк Пціч і Нёман. Яго герб уяўляе сабой падзелены перакуленым зялёным вастрыём сярэбраны іспанскі шчыт з выявай залатога яблыка ў цэнтры. Спадарожнік размешчаны на аднолькавай адлегласці як ад Мінскай кальцавой дарогі, так і ад Дзяржынска — 13 кіламетраў. Ён фактычна прымыкае да межаў Мінскага раёна, але ўваходзіць у склад Дзяржынскага. Фаніпаль займае плошчу больш як 730 гектараў. Нягледзячы на тое, што горадам ён стаў 24 гады таму, мае пяць мікрараёнаў.


СТАР. 4

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Мы павінны быць адзінымі ў адстойванні інтарэсаў сваіх краін і народаў»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кыргызстана ў Беларусі Эрмекам Ібраімавым. Спікер падкрэсліла, што паміж дзвюма краінамі склаліся добрыя дружалюбныя адносіны. Сведчанне таму — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. «Прэзідэнт нашай краіны вельмі дакладна адзначыў, што за гэтыя гады наша ўзаемадзеянне стала глыбокім, рознабаковым. Гэта сапраўды так. Мы рады таму, што расце таваразварот, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва развіваецца дастаткова нядрэнна. Хоць няма мяжы дасканаласці. Мы гэта разумеем. Мы былі б зацікаўлены ў стварэнні сумесных вытворчасцяў і прадпрыемстваў», — сказала Наталля Качанава. Яна нагадала, што створана і працуе міжурадавая камісія. «Я ўпэўнена, што наша ўзаемадзеянне ў гэтым напрамку будзе прырастаць, у гэтым няма ніякага сумнення. Роўна так, як і па ўсіх іншых напрамках жыццядзейнасці нашых краін, — падкрэсліла спікер. — Мы зацікаўлены ў тым, каб сябраваць, супрацоўнічаць з тымі краінамі, з якімі нас звязваюць гістарычныя карані. Мы былі разам у адной краіне калісьці, таму для нас гэта вельмі важна».



Фота БелТА.

Наталля Качанава падкрэсліла, што Беларусь і Кыргызстан павінны быць адзіныя ў адстойванні інтарэсаў сваіх народаў і краін. «Адзіныя для таго, каб не дапусціць тых жудасных падзей, калі плячо ў плячо кіргізы і беларусы адстойвалі сваю агульную Айчыну. Зусім нядаўна мы адзначалі гэтыя даты, дзесьці журботныя, дзесьці радасныя: 9 мая, 22 чэрвеня, 3 ліпеня — Дзень Незалежнасці нашай краіны. І беларусы як ніхто разумеюць цану міру і спакою ў краіне», — адзначыла яна. Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, сёння ідзе ваеннае нагнятанне паблізу ад беларускіх граніц. «Мы шмат разоў рабілі заявы, і мы, члены Савета Рэспублікі, звяртаем увагу на тое, што мы ніколі нікому не пагражалі і не пагражаем. Мы будзем толькі абараняць сваю краіну. І мы разумеем, як гэта можа быць, таму што першыя зведалі гэта на сабе, калі ў чэрвені 1941 года на нас напалі. Беларусь заўсёды, на жаль, з'яўляецца эпіцэнтрам такіх трагічных падзей. Таму сёння адстойваць мір, свабоду, незалежнасць сваёй краіны — гэта першачарговая задача. Гэта тое, што робіць наш Прэзідэнт. І мы імкнёмся рабіць усё для таго, каб тыя краіны, якія разумеюць нашу палітыку, разумеюць, як жыве сёння беларускі народ, падзялялі з намі гэтую занепакоенасць захаваннем міру і спакою ў нашых краінах», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Спікер таксама заўважыла, што міжпарламенцкае супрацоўніцтва Беларусі і Кыргызстана выходзіць на новы ўзровень. «Мы гэта з задавальненнем адзначаем для сябе і чакаем з візітам нашых калег — парламенцкую дэлегацыю, якая падвердзіла свой афіцыйны візіт на чале са старшынёй у пачатку кастрычніка, — адзначыла Наталля Качанава. — Мы плануем удзельнічаць у пасяджэнні Савета Міжпарламенцкай асамблеі СНД у Бішкеку 16—17 лістапада». Спікер падкрэсліла, што ў сённяшніх умовах нашым краінам як ніколі трэба быць разам. Па яе словах, узаемадзеянне ў такіх інтэграцыйных структурах, як МПА СНД і АДКБ, вельмі важнае. «Мы ўдзячныя вам за падтрымку. Мы хочам стаць паўнапраўнымі членамі ШАС і спадзяёмся, што гэта ў найбліжэйшы час адбудзецца», — дапоўніла Наталля Качанава.

«Я поўнасцю падзяляю вашу ацэнку адносна паскарэння міжпарламенцкага супрацоўніцтва. У гэтым плане ў нас вельмі ўраджайны і добры год. Наша дэлегацыя сёлета ўжо адзін раз наведала гасцінную Беларусь. І мы наведаем Беларусь яшчэ раз да канца года. Ёсць агульнае разуменне таго, што міжпарламенцкае супрацоўніцтва — адна са складовых частак двухбаковага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі», — адзначыў Эрмек Ібраімаў.

Паводле яго слоў, Кыргызстан ніколі не быў схільны да якой-небудзь кан'юнктуры. «Мы сябруем шчыра, без якога-небудзь прагматызму. Таму наша дэлегацыя едзе з вельмі вялікімі чаканнямі, — адзначыў пасол. — Шматабяцальныя лічбы па тавараабароце. І менавіта з Беларуссю ў Кыргызстана самы дынамічны рост цяпер. Гэта яшчэ адно з пацвярджэнняў таго, што абедзве краіны сапраўды пазітыўна настроены».

**Паводле БелТА.**

Па палічках

# Датэрмінова, але не бескантрольна

## Што зменіцца ў парадку распараджэння і выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу

**З 12 ліпеня 2023 года набыла сілу пастанова Савета Міністраў, якой скарэкціравана палажэнне аб парадку і ўмовах прызначэння, фінансавання (перапічэння), распараджэння і выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу. Сутнасць змен распавялі БелТА ў Мінпрацы і сацабароны.**

Праграма «Сямейны капітал» дзейнічае з 2015 года, і за больш як 8 гадоў на дэпазітныя рахункі сем'яў дзяржавай залічана больш як Br3 млрд. Шматдзетныя сем'і могуць датэрмінова выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў, медыцыну, адукацыю і набыццё сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі для члена сям'і з інваліднасцю.

Цяпер **жылыя памяшканні, якія набываюцца з выкарыстаннем сродкаў сямейнага капіталу, будуць абследавацца на адпаведнасць устаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням з афармленнем адпаведнага акта**. Абследаванне будуць праводзіць ужо створаныя ў рай-, гарвыканкамах пастаянна дзейныя міжведамасныя камісіі. Праходзіць яно будзе са згоды ўласніка (уласнікаў) жылля і з прыцягненнем пры неабходнасці прадстаўнікоў дзяржаўных органаў пажарнага, газавага, энергетычнага і іншых наглядаў.

Новая пастанова **пашырыла пералік падстаў для прыняцця рашэння аб адмове ў датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу**. Адмоўлена будзе пры неадпаведнасці набытага жылля ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням, пры адсутнасці згоды ўласніка (уласнікаў) на правядзенне абследавання жылых памяшканняў і пры неналежным выкананні абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей, калі датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу супярэчыць іх інтарэсам.

Таксама цяпер дзеянне рашэння аб прадастаўленні права на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу будзе прыпынена. Калі бацькі па рашэнні суда будуць пазбаўлены бацькоўскіх правоў, у іх адбяруць дзіця (дзяцей) або адменяць усынаўленне, то органы апекі на працягу 3 рабочых дзён з дня паступлення адпаведнага рашэння суда паведамляюць аб гэтым у выканкам. Той у сваю чаргу на працягу 7 працоўных дзён прымае рашэнне аб прыпыненні дзеяння прынятага рашэння і накіроўвае яго копію ў ААТ «ААБ Беларусбанк», пасля чаго пералічэнне сродкаў сямейнага капіталу спыняецца.

З новай пастановай на **рай-, гарвыканкамы ўскладзены абавязкі па ажыццяўленні маніторынгу** выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу ў адпаведнасці з прынятымі рашэннямі аб іх датэрміновым распараджэнні.

Змяненні ўнеслі і ў форму рашэння аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу. Цяпер яна **дапоўнена інфармацыяй аб неабходнасці звароту па дзяржаўную рэгістрацыю права ўласнасці на жыллё і (або) дзяржаўную рэгістрацыю забароны на яго адчужэнне**. Зрабіць гэта неабходна не пазней за тры месяцы з дня заключэння дагавора куплі-продажу або дня пералічэння сродкаў на пагашэнне крэдыту, пазыкі. Гэта неабходна для пацвярджэння мэтавага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу. Абавязак грамадзян звяртацца па дзяржаўную рэгістрацыю права ўласнасці на набытае жыллё ўстаноўлены ў Жыллёвым кодэксе.

Цяпер на працягу сямі дзён тэрытарыяльныя арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці будуць апавяшчаць рай-, гарвыканкамы аб дзяржаўнай рэгістрацыі забароны на адчужэнне жылля.

Таксама дзяржаўныя органы (арганізацыі), у якіх грамадзяне знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на працягу сямі дзён будуць апавяшчаць рай-, гарвыканкамы аб зняцці грамадзяніна і членаў яго сям'і з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**Змяненні ўнесены і ў пералік дакументаў і (або) звестак**, якія самастойна запытваюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур па заявах грамадзян (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 верасня 2020 года нумар 541).

**Такім чынам, для прыняцця рашэння аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу з 12 ліпеня 2023 года будуць дадаткова запытвацца акт абследавання стану жылога памяшкання на адпаведнасць устаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням; звесткі аб прызнанні дзіцяці (дзяцей), якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы або маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне; звесткі аб адабранні дзіцяці (дзяцей) у бацькоў па рашэнні камісіі па справах непаўналетніх рай-, гарвыканкама або органа апекі і папячыцельства.**

Па сутнасці

# КОД ХЛЕБА



У кожнай краіны — свой шлях. У кожнага народа — свая дарога. Цяпер мы дайшлі да Беларусі. Суседзі губляюць сябе і сваю самастойнасць. А мы дайшлі да Беларусі. Дайшлі таму, што паабапал таго шляху — жытнёвыя палеткі нашай роднай краіны. Жыта — значыць жыццё.

Мне пашчасціла. Маці вучыла любіць, берагчы, паважаць хлеб. Натхняцца роднымі палеткамі. Мне пашчасціла на вясковае дзяцінства. Родную хату, нібыта лесніхоўку, падковай апаясваў лес. Наша пушча. А далей — неабсяжная далячынь палеткаў. Канешне, не стэпавы размах. Але мне хапала для «разгону» дзіцячай душы да нябёсаў. Я рос разам з жытам. Як і рунь, узбагачаўся моцай зямлі нашай.

Мне пашчасціла. Працаваць у пуле Першага. І падарожнічаць па нашай краіне. Што ні траса, што ні магістраль — абапал хлебныя нівы. Вось і зараз у дарозе. Зялёныя шаты вякавых пушчаў, шумныя гаі, вірлівыя рэчкі і гарэзлівыя рачулкі, дагледжаныя вёскі. Пейзаж мірнай і такой сваёй Беларусі. Твар сапраўднай і дзейснай Еўропы. А яшчэ помнікі загінулым землякам, пераможцам. Тым, хто здабыў нам магчымасць «людзьмі звацца». Вырошчваць хлеб.

Мы — цывілізацыя хлеба. Сейбіты, аратыя. Адзін з пачынальнікаў нашай літаратуры і нацыянальнай ідэі Францішак Багушэвіч з сялянскім гонарам пісаў: «*Не цурайся мяне, панічок, // Што далонь пакрываюць мазолі. // Мазоль — працавіты значок. // Не заразіць цябе ён ніколі*». А з нашых напрацаваных рук усю гісторыю намагаюцца вырваць плуг. Каб у свае руплівыя рукі беларусы — нібы тыя лёкаі — узялі начныя гаршкі альбо вопратку тэўтонскага рыцара, шведскага жаўнера, французскага гусара, польскага пана, нямецкага бургера, англасакса. Усе яны паасобку і разам палілі нашы палеткі, каб уладарыць на нашай зямлі. Не выйшла. Не атрымалася. Што ні стагоддзе, то кожнага чацвёртага, трэцяга, другога беларуса захопнікі знішчалі. Бо мы цывілізацыя хлеба, а не тратылу. А зямля наша — перакрыжаванне цывілізацый — заўжды прыцягвае геапалітычныя маланкі і навальніцы. Але, нягледзячы на ўсе гэтыя выпрабаванні, зярняткі нашай нацыі заўжды прарасталі ў роднай глебе. Каласіліся.

Добра, што не ўсе мы ператварыліся ў бізнесменаў, фрылансераў і валацуг па іншаземных берагах ды кафэ. Мы засталіся сейбітамі. Таму і вытрымалі 2020 год. Амаль адзіныя ў свеце. Ніхто лепей пасля «каляровых хвалявання» жыць не стаў. Ні людзі, ні краіны. Беларусы не адарваліся ад пупавіны, якая знітаваная з бацькоўскімі палеткамі. Таму ў 1994-м 10 ліпеня амаль у адзіным парыве выбралі Сейбіта. Калі родная зямля будзе на першым месцы, тады ўсё астатняе — на сваіх. Вось яна — сапраўдная палітыка Незалежнасці. Чалавек павінен акідваць позіркам увесь свет, але нагамі моцна стаяць на роднай зямлі. І гэта ўвесь час так у нашага Першага. Саміты, міжнародныя сустрэчы. А потым — дадому. Прэзідэнт неадноўчы прызнаваўся: колькі дзён — і ўжо сумуе па Айчыне. Каб басанож па родных палетках, з касой на родныя паплавы. Пад шаты александрыйскіх дубоў, да вады роднай крыніцы, што змывае любую стому. Ці не ў гэтым сакрэт палітычнага даўгалецця Лукашэнкі? Не адрываецца ад роднай зямлі. Не грэбаваць паездкамі па калгасах. Сёння Лукашэнка — сусветны палітык. Але яшчэ і душэўны. Бо не забывае пах жытнёвага поля. Бо чула адносіцца да слоў аб Радзіме і буслах у небе Беларусі. Гэта я пра прызнанні эстрадных зорак на фестывалі ў Александрыі.

Ці не таму вучыць «Купалле» ў Александрыі? Няма больш такога фестывалю ў свеце, які б так вучыў паважаць свае карані. Бохан свайго хлеба. Купалле — гэта заўжды пра еднасць чалавека з прыродай, з родам, раднёй, Радзімай. У свяце зашыфраваны код хлеба. Сапраўднага. Калі змяняюць код хлеба, то «перапрашываюць» і самога чалавека.

Але тое не пра нас. Мы сапраўдныя. Там, дзе былі плацдармы Вялікай Айчыннай, цяпер каласіцца жыта. Сімвал жыцця. Мы працавітыя людзі. Нас не трэба пугай выганяць у поле. Там, дзе намагаліся над нашымі паўгалоднымі продкамі ўладарыць паны, сёння водар роднага хлеба — фестываль «Бацькава булка». Замест разбэшчанага «Еўрабачання» гучыць мелодыя сяброўства «Славянскі базар». Замест разбуральнай «прыхватызацыі» — мелодыя жыцця на прадпрыемствах і заводах. Бо ўсё пачалося з намагання Сейбіта зберагчы свой хлеб. Зараз гэта не толькі пра эканоміку. Зараз гэта — увогуле пра лад жыцця. Традыцыйны лад.

Абапал шашы золата Беларусі — жытнёвыя палеткі. Ужо пачалі шчыраваць камбайны. У сінявокай вышыні буслы, а пад іх крыламі — караблі палёў. Гледзячы на такую карціну, разумееш, што Беларусь рухаецца ў правільным напрамку. Па краіне лунае водар хлеба. У Александрыі гучаць спрадвечныя песні продкаў. Крупіцца кола жыцця. Колас шэпчацца з нябёсамі. Сапраўдны дыялог вечнасці.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# У рытмах фестывалю

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Як вынік — танцоры атрымалі дыплом першай ступені. Школа танца «Атмасфера» з нумарам «Крумкач» з Барысава атрымала Гран-пры, што яшчэ раз пацвярджае прафесіяналізм і высокі харэаграфічны ўзровень беларускіх танцораў.

11 ліпеня ў музеі-сядзібе Ільі Рэпіна «Здраўнёва» адкрылася выстаўка «Сядзібная культура ў творчасці Л. М. Талстога і І. Я. Рэпіна». Экспазіцыя ўключае здымкі, дакументы, мастацкія работы — усё тое, што расказвае аб сяброўстве і ўзаемным уплыве пісьменніка і мастака. Выстаўка будзе працаваць у «Здраўнёве» да 12 жніўня.




У той жа дзень, 11 ліпеня, у Цэнтральнай выставачнай зале Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі жывапісу Леаніда Шчамялёва, прымеркаванай да 100-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі. У экспазіцыі, прадстаўленай у рамках міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», дэманструюцца жывапісныя работы майстра з фондаў Музея гісторыі горада Мінска і Беларускага саюза мастакоў.



Плеяду «Тэатральных сустрэч» у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа адкрыў спектакль «Дзеці. Вёрсты». А ўчора на коласаўскай сцэне выступілі доўгачаканыя госці — Маскоўскі музычна-драматычны цыганскі тэатр «Рамэн» з праграмай «Мы — цыганы». Сёння на чарзе выступленне Маладзёжнага тэатра эстрады, які прадставіць мюзікл-біяграфію «Гур'янаў».

Адной з самых цікавых і хвалюючых падзей аўторка стала жараб'ёўка ўдзельнікаў XXI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2023». Сёлета змагацца за Гран-пры будуць юныя вакалісты з 18 краін, для якіх арганізатары падрыхтавалі тэматычны Новы год з Дзедам Марозам, ёлкай і падарункамі. Так, прадстаўніца Беларусі Сафія Рустамава адкрыла першы конкурсны дзень песняй Ірыны Дарафеевай «Акрыляй», а сёння, на другім этапе вакальнага спаборніцтва, яна выступае пад трэцім нумарам з кампазіцыяй Уітні Х'юстан «I have nothing». Сімвалічны нумар выцягнуў і прадстаўнік Узбекістана Раўшан Ташхаджаеў — ён два дні выступае пад шчаслівым нумарам 13.

Галоўная сцэнічная пляцоўка фестывалю мастацтваў — Летні амфітэатр — учора адчыніла свае дзверы ў абноўленым варыянце для творчага вечара групы Аўра «Мір нашаму дому», прысвечанага Году міру і стваральнай працы. Радавалі гасцей і жыхароў горада зоркі беларускай эстрады: Анатоль Ярмоленка, Алёна Ланская, Руслан Аляхно, Аляксандр Саладуха і іншыя. А вечарам на пляцоўцы open-air каля канцэртнай залы «Віцебск» прайшло шоу Сяргея Лазарава.

Найбольшую колькасць зорак замежнай эстрады традыцыйна прымае турысцка-гасцінічны комплекс «Лучоса». Да форуму мастацтваў тут рыхтаваліся задоўга: абнавілі нумары, сістэмы кандыцыяніравання, кухоннае абсталяванне. Падчас фэсту гасцінічны рэстаран будзе працаваць кругласутачна, а яго разынкай сёлета стала валошкавае меню. Для аматараў водных прагулак працуе летні плывучы рэстаран на Заходняй Дзвіне. Прагулачны цеплаход «Віцебск», які пару тыдняў таму прышвартаваўся ў цэнтры горада каля драмтэатра, цяпер ператвaрыўся ў шыкоўнае месца для адпачынку.

Кругласутачна на варце грамадскага парадку і аховы здароўя ў Віцебску стаяць узмоцненыя падраздзяленні супрацоўнікаў міліцыі, МНС і хуткай дапамогі. Для забеспячэння экстраннай і неадкладнай медыцынскай дапамогі ўдзельнікам і гасцям фестывалю пры правядзенні мерапрыемстваў арганізавалі дзяжурства каля 20 медбрыгад, а ў Летнім амфітэатры ёсць урач-отарыналарынголаг, які пры неабходнасці зможа аказаць неадкладную фаніятрычную дапамогу артыстам.

Цікавы факт: сёлета ў фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» плануюць узяць удзел звыш пяці тысяч чалавек больш як з 30 краін. Асвятляць падзеі форуму будуць каля 450 журналістаў з сямі краін.

Сёння ўзняўся сцяг Міжнароднага фестывалю мастацтваў, а гэта значыць, што ўвечары адбудзецца цырымонія ўрачыстага адкрыцця форуму, дзе з прывітальным словам выступіць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**



## Супрацоўніцтва

# Сфарміравана новая мадэль стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая

**Аб гэтым заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ падчас пятага пасяджэння Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта, паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада.**

У Пекіне абмеркаваны практычныя пытанні рэалізацыі прыярытэтных кірункаў развіцця супрацоўніцтва. Дэлегацыю Беларусі на мерапрыемстве ўзначаліў першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў. Старшыня міжурадавага камітэта з беларускага боку заявіў, што супрацоўніцтва Беларусі і Кітая — узор міжнародных адносін новага тыпу. Устанаўленне ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства — гістарычны крок і новы моцны імпульс для развіцця супрацоўніцтва абедзвюх краін.

Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што створаны ўнікальныя магчымасці і механізмы для паглыблення практычнага ўзаемадзеяння па ўсім спектры напрамкаў. У частцы гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння першы намеснік прэм'ер-міністра звярнуў увагу, што «нашай агульнай мэтай павінен стаць новы пункт росту тавараабароту як мінімум у памеры 120 працэнтаў адносна мінулага года. Для гэтага вельмі важна рэалізаваць механізмы закупак, забяспечыць нарошчванне чыгуначных перавозак і забяспечыць работу «зялёных калідораў».

Кіраўнік дэлегацыі падкрэсліў важнасць развіцця галіновага супрацоўніцтва з выкарыстаннем навукаёмістых тэхналогій і кампетэнцый. У ходзе пасяджэння бакі высока ацанілі працэс станаўлення індустрыяльнага парка «Вялікі камень» як міжнароднага высокатэхналагічнага цэнтра прыцягнення інвестыцый.

У якасці перспектыўных напрамкаў у галіне адукацыі адзначаны пашырэнне сумесных адукацыйных праграм, павелічэнне колькасці сумесных навукова-тэхнічных праектаў і іх укараненне ў вытворчасць. У час пасяджэння бакі таксама абмеркавалі прыярытэты ў паглыбленні навукова-тэхнічнага і гуманітарнага ўзаемадзеяння на найбліжэйшую перспектыву. Па выніках бакі падпісалі шэраг дакументаў, уключаючы план прыкладных мерапрыемстваў па развіцці ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва.

Беларусь і Кітай дэманструюць усяму свету ўзорны прыклад супрацоўніцтва. Аб гэтым напярэдадні заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра на сустрэчы з міністрам камерцыі КНР Ван Вэньтаа. Былі дэталёва абмеркаваны перспектывы развіцця беларуска-кітайскіх гандлёвых адносін. Бакі дамовіліся сканцэнтраваць сумесныя намаганні на стварэнні спрыяльных умоў для нарошчвання ўзаемнага гандлю, развіцці дзеючых і асваенні новых гандлёвых механізмаў, павышэнні эфектыўнасці лагістычных маршрутаў і нарошчванні чыгуначных перавозак, укараненні эфектыўных механізмаў узаемадзеяння па пытаннях паставак у Беларусь важнага абсталявання, сыравіны і матэрыялаў.

Па выніках мінулага года па абароце тавараў краіны дасягнулі рэкорднага аб'ёму $5,8 млрд. Сёлета за пяць месяцаў адзначаны рост тавараабароту ў 1,5 раза. Рэкорднымі тэмпамі павялічваецца экспарт беларускіх тавараў у Кітай: у 2022 годзе — у 1,8 раза, сёлета за студзень—май — у 1,6 раза.

Таксама Мікалай Снапкоў сустрэўся з міністрам фінансаў КНР Лю Кунем. Бакі абмяняліся думкамі аб бягучым стане і перспектывах двухбаковага партнёрства ў крэдытна-інвестыцыйнай сферы ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», дамовіліся ўмацоўваць фінансавае супрацоўніцтва.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Ізраілі пасля пратэстаў супраць судовай рэформы затрымана звыш 70 чалавек



Паліцыя Ізраіля затрымала 71 чалавека пасля акцый пратэсту супраць судовай рэформы, якія праходзяць па ўсёй краіне. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на ізраільскія СМІ. Тысячы маніфестантаў перакрылі ключавыя аўтамагістралі і галоўны міжнародны аэрапорт Ізраіля, пратэстуючы супраць спрэчнага праекта судовай рэформы. Па ацэнках ізраільскага тэлебачання, толькі ў акцыі пратэсту ў аэрапорце прынялі ўдзел да 12 тысяч чалавек. У цэнтры Тэль-Авіва і ў Іерусаліме правааахоўнікі выкарыстоўвалі вадамёты, а ў Хайфе адбыліся сутыкненні паміж паліцэйскімі і пратэстантамі, якія заблакіравалі аўтамабільныя тунэлі. На разгон дэманстрантаў у ізраільскай сталіцы была кінутая конная паліцыя. Паводле звестак медыкаў, у сутыкненнях на працягу дня пацярпелі мінімум дзевяць пратэстантаў і адзін паліцэйскі. Акцыі пратэсту аднавіліся ў Ізраілі з новай сілай пасля таго, як парламент краіны зацвердзіў у першым чытанні першы з законапраектаў, якія адносяцца да прасоўваных урадам прэм'ер-міністра Біньяміна Нетаньяху змен у судовай сістэме.

## Памёр пісьменнік Мілан Кундэра



Французскі пісьменнік чэшскага паходжання Мілан Кундэра, які праславіўся дзякуючы раману «Невыносная лёгкасць быцця», памёр ва ўзросце 94 гадоў. Пра гэта паведаміў чэшскі інфармацыйны тэлеканал СТ24. У 1975-м Кундэра пераехаў у Францыю, праз чатыры гады атрымаў грамадзянства гэтай краіны. «Ён быў адным з самых вядомых ураджэнцаў Чэхіі за мяжой. Неаднаразова згадваўся як кандыдат на Нобелеўскую прэмію па літаратуры», — адзначаецца ў паведамленні. Яго творы атрымалі шырокае чытацкае прызнанне, яны перакладзены на дзясяткі моў. Апошняй кнігай Кундэры, напісанай на чэшскай мове, быў раман «Неўміручасць», пасля якога ён пісаў па-французску. Адно са сваіх апошніх выступленняў (а заадно і зборнік эсэ, нататак і інтэрв'ю «Мастацтва рамана») пісьменнік завяршыў бліскучай самаіроніяй: «Мне час заканчваць. А то я ледзь было не забыўся, што Бог смяецца, калі бачыць, як я думаю...»

## Мінулы тыдзень стаў рэкордна спякотным за ўсю гісторыю назіранняў



На мінулым тыдні зафіксавана рэкордна высокая тэмпература паветра ва ўсім свеце, паведаміла Сусветная метэаралагічная арганізацыя (СМА, спецыялізаваная ўстанова ААН). Паводле звестак дырэктара аддзела кліматычнай інфармацыі СМА Крыстафера Х'юіт, чакаецца, што Эль-Ніньё «яшчэ больш умацуе спякоту як на сушы, так і ў акіянах і прывядзе да больш экстрэмальных тэмператур і марскіх цеплавых хваль». «Мы можам чакаць, што па меры развіцця Эль-Ніньё будзе больш тэмпературных рэкордаў, уздзеянне гэтай з'явы працягнецца да 2024 года», — сказаў эксперт, назваўшы такі сцэнарый «трывожнымі навінамі для планеты». Падкрэсліваецца, што рэкордна высокія тэмпература паветра на сушы і ў акіяне могуць аказваць «патэнцыяльна разбуральнае ўздзеянне на экасістэмы і навакольнае асяроддзе».

# «Спадарожнік» для жыцця: чым Фаніпаль прыцягвае мінчан



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Хуткі рост гэтага населенага пункта выкліканы ў першую чаргу блізкасцю да сталіцы. 80 пар цягнікоў праходзіць праз станцыю Фаніпаль за суткі. Чыгунка аддзяляе жылую зону ад прамысловай. Транспартная дастунпасць зрабіла горад цэнтрам па размяшчэнні вытворчых магутнасцяў і базавай гаспадаркі, якія абслугоўваюць сталіцу і краіну ў цэлым.

Даехаць у Фаніпаль з Мінска проста. Ад станцыі метро «Інстытут культуры» на маршрутцы за 2,5 рубля шлях зойме прыкладна паўгадзіны. Па словах кіроўцы Сяргея, найбольшая загружанасць выпадае на раніцу, калі людзі едуць на работу ў сталіцу, і вечар, калі вяртаюцца дамоў. Інтэрвал паміж маршруткамі — 10—15 хвілін. Альтэрнатыва — электрычка, квіток на якую каштуе 91 капейку.

Недалёка ад маладога горада знаходзіцца зона адпачынку «Пціч», матэль, кемпінг, дачныя ўчасткі жыхароў сталіцы, самога Фаніпаля і ўсяго Дзяржынскага раёна. Вялікую тэрыторыю займаюць тут мікраёны катэджна-сядзібнай забудовы.

Штогод у Фаніпалі адкрываюцца прадпрыемствы розных формаў уласнасці, новыя гандлёвыя пункты, культурна-забаўляльныя ўстановы, развіваецца сфера паслуг, растуць мікраёны, мяняе аблічча старая частка горада.

У Фаніпалі працуе больш за 30 прадпрыемстваў, ёсць паліклініка, аптэка, вузел сувязі, натарыяльная кантора, юрыдычная кансультацыя, тры філіялы банкаў, дом быту, развітая гандлёвая сетка, міні-рынак, кафэ, кафетэрый, камерцыйныя шапікі. У горадзе зарэгістравалі свае абшчыны прадстаўнікі трох канфесій.



Мясцовы Дом культуры нядаўна стаў лаўрэатам раённага агляду-конкурсу, тут вельмі папулярныя цэнтр дзіцячай творчасці, музычная школа, гарадская бібліятэка. У фаніпальскіх гімназіі і сярэдняй школе навучаюцца больш за 2000 дзяцей. Дарэчы, школа славіцца лепшай у раёне спартыўнай залай з 28 трэнажорамі. Для малых фаніпальчан працуюць чатыры дашкольныя ўстановы.

## ШТО ЛЮДЗІ КАЖУЦЬ

Днём тут нешматлюдна. Гэта звязана з тым, што мясцовыя жыхары, як правіла, працуюць у Мінску. Першую сваю суразмоўцу Ларысу я сустрэў недалёка ад крамы.

— Пераехала ў Фаніпаль з Мінска чатыры гады таму. Побач з маім домам — школа і дзіцячы садок. Для жыхароў нашага мікраёна адкрыліся кафэ, ёсць бізнес-цэнтр, у якім працуе цырульня, можна зрабіць пірсінг. У старой частцы Фаніпаля не так ажыўлена. Але і там цяпер таксама будуюць новае жыллё, — расказала Ларыса.

Другога суразмоўцу я спыніў каля паліклінікі. Аляксандр — шматдзетны бацька. Яго сям'я зусім нядаўна пераехала за МКАД.

— У мяне атрымліваецца жыць у Фаніпалі і не глядзець у бок Мінска. Тут можна гуляць па лесе... У цэлым усяго хапае, — падзяліўся Аляксандр.

У жыцці за вялікім горадам ёсць нешта прыцягальнае, адзначаюць мясцовыя жыхары. Для Тацціяны, напрыклад, відавочна, што ў Фаніпалі прадукты таннейшыя, ды і цэны ў сферы паслуг больш прыемныя.

— У Мінску жывуць дарослыя, а тут моладзь, з вокнаў заўсёды ахі-ўздыхі, крыкі дзяцей, народ больш лагодны, — дадае Таццяна.

## ШТО БУДУЕЦЦА

Дэталёвы план забудовы паўднёвай часткі горада-спадарожніка Мінска быў нядаўна вынесены на грамадскае абмеркаванне.

— 28 красавіка распрацоўшчыкі прадставілі праект жыхарам. Плошча горада-спадарожніка значна павялічыцца, — расказаў **старшыня Фаніпальскага гарвыканкама Уладзімір КАРАНЕВІЧ.**

На далучаных да Фаніпаля тэрыторыях узвядуць шматпавярховыя дамы, прадугледжаны грамадска-дзелавая, рэкрэацыйная зоны, індывідуальнае жыллё. Планы будуць рэалізаваны ў два этапы: да 2030-га і да 2035 года.

— У нас ёсць праблемны ўчастак у раёне чыгуначнага пераезду, там пастаянна па раніцах узнікаюць заторы. Па праекце тут будзе пуцеправод, пад якім пройдзе дарога. Зарэзерваваны пляцоўкі і пад будаўніцтва садка, школы. Але якія канкрэтна аб'екты і дзе размесцяцца, пакуль дакладна не вызначана. Гэта перспектыва, — адзначыў кіраўнік горада.

Агульная плошча Фаніпаля павялічыцца амаль на траціну. Новы мікраён зойме 203,5 гектара. Ён часткова знаходзіцца ў межах існуючай гарадской рысы, часткова — на землях Дзяржынскага раёна. Таксама ўключае тэрыторыю вёскі Падсосенне.

— За апошнія пяць гадоў у горадзе пабудаваны два дзіцячыя садкі. Праводзім рамонт дваровых тэрыторый, летась адрамантавалі дзевяць вуліц. Заменена вялікая колькасць водаправодаў, зрабілі дзве свідравіны, пабудавалі рэзервуар на дзве тысячы кубічных метраў. У інвестпраграму ўключаны рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў, рамонт пешаходнага моста праз чыгуначныя шляхі. Будуецца фізкультурна-аздараўленчы комплекс, плануем да 1 верасня ўвесці яго ў эксплуатацыю, — распавёў Уладзімір Караневіч.

Сёння ў Фаніпалі пражывае каля 20 тысяч чалавек. Горад прырастае новабудоўлямі. У прыватнасці, пабудаваны жылы дом на 340 кватэр, сем дамоў для шматдзетных сем'яў, узводзіцца жылы комплекс «Сучасны» на 800 кватэр. 120 сем'яў ужо атрымалі ключы.

— У Фаніпалі з 18 студзеня приступілі да будаўніцтва школы на 1050 месцаў, — дадаў Уладзімір Караневіч. — Новая ўстанова адукацыі будзе адпавядаць сучасным патрабаванням: 44 навучальныя класы, 20 кабінетаў і лабараторый, цір, бібліятэка з чытальнай залай, музей, абедзенная зала на 350 месцаў, рэсурсныя цэнтры, універсальныя майстэрні, спартыўная, гімнастычная, гульнявая, актавая, канферэнц-зала, медыцынскія памяшканні і два басейны. Новую школу павінны здаць да 1 верасня 2024 года.

Цяпер праектуецца паліклініка, а на месцы старой будзе школа мастацтваў. Вуліца Зялёная пашырыцца да чатырох палос. З'явіцца сучасная веладарожка, пешаходная дарожка, асвятленне. Будуюцца паркоўкі з зарадкамі для электрамабіляў і ідзэназіраннем.

— У новым мікраёне пабудуем гандлёвы цэнтр і дамы для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ужо здалі два дамы на 200 кватэр. У праекце — падземны праезд і пешаходны пераход. Плануем пабудаваць парк, акультурыць вадаём, — падагульніў Уладзімір Караневіч.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фоа аўтара.**

### У тэму

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 мая 2023 года падпісаў Указ № 149, якім зацверджаны новыя рэдакцыі генеральных планаў гарадоў-спадарожнікаў Мінска — Смалявічаў, Фаніпаля і Рудзенска. У дакуменце вызначаны стратэгіі развіцця населеных пунктаў да 2035 года: з улікам сучасных тэндэнцый у горадабудаўніцтве.

— Былі перагледжаны асноўныя параметры развіцця гарадоў-спадарожнікаў, удакладнены тэрыторыі, вызначаны рост колькасці насельніцтва, які мы мяркуем, расказаў журналістам **намеснік старшыні Камітэта архітэктуры і будаўніцтва Мінскага аблвыканкама Аляксей НОВІКАЎ.** — У нейкіх гарадах ён быў перагледжаны з мэтай змяншэння. Гэта трэба, каб Смалявічы, Рудзенск і Фаніпаль не ператварыліся ў спальныя раёны сталіцы. А былі гарманічнымі гарадамі, зручнымі для пражывання, дзе створана і яшчэ ствараецца неабходная сацыяльная інфраструктура. Гэта бальніцы, паліклінікі, садкі, школы, спартыўныя ўстановы. Гэта і тэрыторыі для развіцця вытворчых прадпрыемстваў, стварэнне працоўных месцаў. У выпадку з Рудзенскам — стварэнне вялікай вытворчай зоны. Таксама мы пастараліся ўлічыць урбаністычныя працэсы, што асабліва актуальна для Рудзенска. Побач з пасёлкам даволі вялікія населеныя пункты, якія мы ўлічваем і ўключаем у адзіную сетку. Рассяляем людзей, задзейнічаем працоўныя рэсурсы, каб знізіць маятнікавую міграцыю. Наша мэта — зрабіць усё магчымае, каб у гарадах-спадарожніках людзям было камфортна жыць і працаваць.





# ЧАРОЎНАЕ МЕСЦА СІЛЫ



*Можна толькі паспачуваць тым, хто праводзіць лета ў душнай гарадской кватэры. І не таму, што замест вясковага адпачынку людзі аддаюць перавагу аквапаркам, летнім кафэ, атракцыёнам і іншым, выключна гарадскім, забавам. Проста хапае сярод сучасных беларусаў тых, каго нішто не звязвае з вёскай. У горадзе жывуць іх бацькі, даўно тут прапісаліся і дзядулі з бабулямі, пра лецішча таксама ў свой час не было каму паклапаціцца. Вось і радуюцца сучасныя дзеці карове, якую бачаць так рэдка, як жырафа ў заапарку, і здзіўляюцца, як з маленькага зярнятка можа вырасці агурок або гарбуз.*

*Мне пашчасціла нарадзіцца ў вёсцы. Сюды, на малую радзіму, па магчымасці вырываешся з мітуслівай сталіцы. Да бацькоў спяшаешся ў любы час года, аднак летам жаданне часцей і на больш доўгі тэрмін застацца ў вёсцы чамусьці ўзмацняецца. Вось і гэтым разам замест замежных курортаў і айчынных здраўніц аддалі перавагу невялічкай вёсцы на Гродзеншчыне. Менавіта тут маё месца сілы. Менавіта тут адпачываеш напоўніцу.*

*Хоць у маім дзяцінстве летам у вёсцы было не да адпачынку. Акрамя ўласнага агарода былі яшчэ і палеткі, замацаваныя за кожнай сям'ёй. На сотках, як мы іх называлі, расла бульба і буракі. Палоць іх за лета даводзілася не аднойчы. Восенню з'яўляліся іншыя клопаты — ураджай трэба было ўбраць і спарадкаваць.*

*Лета майго дзяцінства — гэта перш за ўсё ягады. Акрамя садовай маліны ды вішні, якія трэба было своечасова абабраць ды нешта з іх зрабіць, штораніцы хадзілі з мамай у лес. Спачатку збіралі суніцы, потым — чарніцы. Калі сваёй маліны было мала, хадзілі па лясную. Елі ягады не шкадуючы. Кампоты ды варэнні мама ставіла тады, калі мы з братам на ягады ўжо глядзець не маглі.*

*Нарыхтоўкі вяліся на працягу ўсяго лета. Не паспелі скончыцца ягады — браліся за агуркі, гарошак, памідоры, перцы. У жніўні тазікамі наразалі салаты — запас на зіму ствараўся грунтоўны. І на кожным этапе работы мне як дзяўчынцы даводзілася дапамагаць. У бацькі з братам хапала свайго клопату.*

*Вядома, «рабаўладальніцтва» ў сям'і ніколі не было. Знаходзілі час і на тое, каб пакупацца ў вазеры ці рэчцы — вадаёмаў, чыстых і бяспечных, побач хапала. Гэта было, як правіла, днём: на санцапёку бацькі працаваць не дазвалялі. Увечары, у выхадныя дні, мы з дзяўчатамі хадзілі на танцы: то ў сваю вёску, то на чарзе — у дзве суседнія.*

*Згадваецца і яшчэ адна летняя традыцыя. У той час, як некаторыя збіраліся ў летнікі ці да мора, мы з мамай складвалі самыя прыгожыя сукенкі ў сумкі і планавалі паездку да маіх гарадскіх бабулі і дзядулі. У Баранавічы ехалі на цягніку. Гэта быў цэлы рытуал з перакусам і добрай кнігай. У горадзе бабуля Марыя і дзед Валодзя песцілі адзіную ўнучку як маглі. Вадзілі мяне па парках ды заапарках, кафэ і крамах, якія дагэтуль я бачыла толькі па тэлевізары, набывалі мне прыгожыя і, відаць, нятанныя прадметы гардэробу, кармілі прысмакамі, якія звычайна з'яўляліся на стале толькі ў святочныя дні. Адным словам, у той час, калі многія мае сябры з горада ехалі ў вёску, я не магла дачакацца лета, каб пагасцяваць у сваіх гарадскіх бабулі ды дзядулі.*

*У вясковых — дзядулі Івана і бабулі Тарэсы — была свая атмасфера. У іх невялікай хаце збіраліся ўсе чатыры ўнучкі, зрэдку, але пад'язджалі і старэйшыя браты. Размовы каля кастра да ночы, адпачынак на лясным возеры, самыя духмяныя бабуліны бліны з мачанкай або варэннем з толькі што назбіраных суніц...*

*Што будуць успамінаць нашы дзеці, якія днямі сядзяць у тэлефонах ды камп'ютарах?!*

*У нашай вёсцы, на шчасце, такіх амаль не сустрэнеш. Безумоўна, тэлефоны ды камп'ютары ў дзяцей, асабліва гарадскіх, ёсць. Але іх яны пакідаюць дома: на свежым паветры хапае чым заняцца. Мой Арцемій не паспее вочы расплюшчыць — хутчэй на вуліцу. Пакуль старэйшыя дзеці, з якімі ён бавіць час, яшчэ спяць, яны з дзедам Іванам пойдуць на агарод, паядуць гарошку, ягад. Крыху пазней, ужо з бабуляй Ірай, назбіраюць агуркоў ды прынясуць у хату. Пасля будуць гульні з дзецьмі, катанне на веласіпедах, будаўніцтва «логава» (так малыя называюць ці то шалаш, ці то домік), іншыя забавы — і так да самага вечара. Бабуля з дзядулем па некалькі разоў будуць клікаць унука спачатку на абед, потым — на вячэру і карміць самымі смачнымі блінамі з варэннем са свежых ягад...*
*І так, хочацца верыць, яшчэ шмат гадоў. У выніку наш гарадскі ўжо хлопчык, калі вырасце, будзе добра ведаць, што такое вёска. І, спадзяюся, некалі прывязе туды сваіх дзяцей, для якіх гэты найцудоўнейшы куточак Гродзеншчыны стане ўласным месцам сілы.*

**Вераніка КАНЮТА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 12 (215)


Тыя, хто побач

Саліст Музычнага тэатра Антон ЗАЯНЧКОЎСКІ:

# «Ірына мне спадабалася з першага погляду»

**Менавіта так калегі характарызуюць сям'ю заслужаных артыстаў Беларусі Ірыны і Антона ЗАЯНЧКОЎСКІХ. Бліскучыя на сцэне, яны вельмі цікавыя і ў жыцці. Пра такіх жанчын, як Ірына, кажуць: агонь — яркая, эмацыянальная. Антон — спакой і грунтоўнасць. У іх вялікі тэатральны стаж, але пры гэтым захаваліся трапяткія адносіны да сцэны. Зрэшты, гутарылі мы больш аб сямейным жыцці. І, ведаеце, часам жэсты гавораць больш, чым словы. За размовай то Ірына, то Антон як бы міжволі дакраналіся адзін да аднаго, а яшчэ ў іх вачах было столькі пяшчоты і захаплення!.. Перш чым сустрэцца ў адным тэатры, кожны з іх прыняў сур'ёзныя рашэнні ў сваім жыцці. Антон вучыўся ў Львоўскім вышэйшым ваенна-палітычным вучылішчы, але пайшоў адтуль пасля першага курса. Ірына разышлася з мужам, жыла і працавала ў Рызе, а потым прыехала ў Мінск.**

***— Раскажыце аб сваім жыцці да лёсавызначальнай сустрэчы...***

**Антон Заянчкоўскі (А. З.):** Я родам з Гродна і пасля заканчэння школы паступіў у мясцовае педвучылішча, разумеючы, што гэта для мяне першая прыступка ў атрыманні музычнай адукацыі. Гэта заўважыў і наш ваенрук, які параіў ехаць паступаць у Львоў: маўляў, будзеш потым кіраўніком Дома афіцэраў. Я нават не ведаў пра такое вучылішча. У час вучобы было мала музыкі, а шмат страявой падрыхтоўкі, што мяне зусім не задавальняла.

Пасля вяртання ў Беларусь мне пашанцавала: паступіў у Мінскае музычнае вучылішча, маім педагогам быў Адам Асманавіч Мурзіч, ён і прывёў у наш тэатр.



Разам на сцэне і ў жыцці.

**Ірына Заянчкоўская (І. З.):** Я нарадзілася ў цяперашнім Екацярынбургу, хоць у сям'і ёсць беларускія карані. Мае бацькі — артысты, таму сям'я пакалясіла па СССР. Вучылася ў ГИТИСе, вытрымаўшы вялізны конкурс. Многія бацькі настройваюць дзяцей толькі на поспех. Мае ж далі зразумець, што калі не паступлю, то гэта не канец свету, для іх я ўсё роўна буду любімай дачкой, а не няўдачніцай.

Цяпер думаю, што паспяшалася выйсці замуж, прыняўшы, як гэта часта бывае, закаханасць за каханне, гледзячы на партнёра скрозь ружовыя акуляры. Мне здавалася, што трэба і дзіця нарадзіць хутчэй, таму што, не маючы досведу мацярынства, не змагу пераканаўча іграць шматлікія ролі. Але сямейнае жыццё не складалася, і мы разышліся.


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*


Ваша здароўе

# КУДЫ ВОЧЫ ГЛЯДЗЯЦЬ

## Прагрэсіўныя акуляры і начныя лінзы для добрага зроку

**Як адбілася лічбавая эпоха на нашым зроку? Што такое прагрэсіўныя акуляры? Чаму спецыялісты ўсё часцей рэкамендуюць начное нашэнне лінзаў? Гутарым пра гэта з доктарам медыцынскіх навук, прафесарам кафедры афтальмалогіі БелМАПА Вікторыяй КРАСІЛЬНІКАВАЙ.**



***— XXI стагоддзе кардынальна змяніла нашу штодзённасць — яе ўжо немагчыма ўявіць без камп'ютара і разнастайных гаджэтаў. Ці можна сказаць, што новая рэальнасць негатыўна адбілася на зроку дарослых і дзяцей?***

— Я не стала б рабіць такія высновы. Маштабаў эпідэміі сітуацыя не набыла. Як ні дзіўна, прырода прыкладна гэтак жа, як і раней, размяркоўвае працэнтныя суадносіны людзей з міяпіяй, дальназоркасцю, касавокасцю, астыгматызмам. Рост разнастайных парушэнняў зроку тлумачыцца павелічэннем працаздольнага жыцця, старэннем насельніцтва. Але разам з тым нельга не прызнаць — гаджэты не дадалі сучаснікам здароўя. Калі празмерна доўга глядзець зблізку на экран смартфона, планшэта, ноўтбука і г. д., развіццё міяпіі непазбежнае. Сёння ўжо 50 % школьнікаў мае анамаліі рэфракцыі. Новая лічбавая рэальнасць прывяла да большай гіпадынаміі, а яна паскарае старэнне арганізма.

## Не прамаргаць глаўкому

***— Ці праўда, што з узростам катаракта развіваецца ва ўсіх без выключэння?***

— Памутненне і зацвярдзенне хрусталіка пасля 40 гадоў пачынаецца ва ўсіх, але гэта не значыць, што катаракта непазбежная. Ёсць шчаслівчыкі, якія дажываюць да 90 гадоў, не маючы істотных праблем са зрокам. А ёсць прыклады, калі ў 30-гадовых паяўляюцца змены ў хрусталіку, і гэта можа прывесці да развіцця катаракты.

***— Катаракта паспяхова лечыцца? Якія метады пры дадзеным дыягназе найбольш эфектыўныя?***

— Сёння можна вярнуць пацыенту зрок незалежна ад стадыі катаракты. Залаты стандарт сучаснай медыцынскай дапамогі пры такім дыягназе — замена ўласнага хрусталіка штучным. Калі захворванне не спалучаецца з паталогіяй сятчаткі, павышэннем унутрывочнага ціску, памутненнем рагавіцы, то пасля лячэння вастрыня зроку можа стаць нават вышэйшай, чым была.


*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*

Давай дамовімся!

# КАНФЛІКТ — У ІНТЭРНЭЦЕ, РАШЭННЕ — У РЭАЛЬНАСЦІ

## Як «разруліць» спрэчкі з дапамогай медыяцыі, TikTok і коміксаў

**Медыяцыя дапамагае не толькі вырашаць спрэчкі мірам, але і прадухіляць іх узнікненне, а яшчэ вучыць адказнасці. Тэхнікі медыяцыі, асабліва аднаўленчыя, дазваляюць разабрацца з праблемай, якая яшчэ толькі ствараецца, то-бок рабіць прафілактыку канфліктаў. Гэтыя і іншыя магчымасці медыяцыі на прыкладзе канкрэтных гісторый з жыцця абмяркоўваліся нядаўна на VI фестывалі «Медыяцыя будучыні для школьнікаў і студэнтаў».**

Сёлета мерапрыемства стала месцам, дзе не проста падводзяць леташнія вынікі, а ставяць мэты і задачы на будучы год, і кожны ўдзельнік можа агучыць свае планы. Больш за тое, фестываль вырашылі не абмяжоўваць двума днямі, а весці работу цягам года. З восені медыятары-школьнікі разам са спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных і Следчага камітэта будуць адпрацоўваць медыяцыйныя тэхнікі ў рэгіёнах. Гэта неабходна для таго, каб данесці да школьнікаў уяўленне аб рызыцы ўзнікнення канфліктаў у рэальным і лічбавым жыцці, а таксама навучыць іх абараняць сябе і інфармацыю аб сабе. А ў школах, думаецца, з'явяцца ролікі TikTok пра бяспечныя паводзіны ў сеціве.

### Для школьнікаў, настаўнікаў і студэнтаў

Школьная медыяцыя (адпаведны праект пачынаўся ў 2016-м) вырасла да памераў медыяцыі ў сферы адукацыі. Створана канцэпцыя аб развіцці медыяцыі ў сферы адукацыі да 2025 года. З'явілася практыка медыяцыі ў школах, каледжах, універсітэтах. Сёлета фестываль, які прайшоў ужо шосты раз, стаў пляцоўкай, дзе не проста падводзяць леташнія вынікі, а ствараюць мэты і задачы на будучы год, і кожны ўдзельнік можа агучыць свае планы.

Ужо само ўрачыстае адкрыццё мерапрыемства стала не проста афіцыйнай імпрэзай, а месцам для дыялогу моладзі і спецыялістаў. Падчас асобнай сустрэчы экспертамі ў медыяцыі выступілі самі школьнікі і студэнты, якія ўжо маюць практычны вопыт работы ў гэтай сферы.



— Замест запланаванай гадзіны брыфінг доўжыўся 2,5 гадзіны і ператварыўся ў жывы дыялог, з якога стала зразумела, чым кіруюцца падлеткі-медыятары, з якімі праблемамі сутыкаюцца, што іх хвалюе. Яны расказалі, як медыяцыйныя веды дапамагаюць ім у штодзённым жыцці — дома, у школе, у стасунках з бацькамі і аднагодкамі, падзяліліся тым, як бачаць выкарыстанне медыяцыйных практык у далейшым, — расказала **Ірына АРЛОЎСКАЯ, намеснік дырэктара Цэнтра «Медыяцыя і права».** — Дзве студэнткі, якія ўжо год адвучыліся ў БНТУ і медуніверсітэце, а дагэтуль практыкавалі медыяцыю ў школе, выказалі жаданне стварыць службы медыяцыі ў сваіх ВНУ. І гэта цудоўна, што ініцыятыва на распаўсюджванне медыяцыі ідзе не ад дарослых, а ад моладзі. А некаторыя дзяліліся гісторыямі з уласнага жыцця, як медыяцыя дапамагла ім ператварыцца з хуліганаў, якія не толькі вырашалі праблемы сілавымі метадамі, але і правакавалі іх, — у праваднікоў медыяцыі і шукальнікаў мірных шляхоў для выйсця з канфлікту.

Цікава, што падчас разбору гісторый з практыкі, з якімі працавалі самі школьнікі, паміж маладымі людзьмі пачалася дыскусія, як можна было б вырашыць праблемную сітуацыю, якая ўзнікла, па-іншаму. Такім чынам, госці, што трапілі на фестываль упершыню, убачылі, як працуе медыяцыя, — гэта не проста набор правільных фраз і прыгожых учынкаў, а дакладныя сітуацыі, з якімі ўжо разабраліся і вырашылі праблему. Фактычна, мы маем ужо гатовых медыятараў, хоць пакуль яшчэ і вучняў 7—9-х класаў, заўважыла спецыяліст:

**— У кожнай школе медыяцыя развіваецца па-рознаму: дзесьці ўжо зладжана працуюць службы са школьнікаў-медыятараў, дзесьці яны толькі на пачатку шляху, а некаторыя ўстановы выступаюць як рэсурсныя цэнтры, што прыходзяць на дапамогу ў вырашэнні канфліктаў у тых школах, дзе ўвогуле няма службы медыяцыі.**

Падчас фестывалю прайшла і навукова-практычная канферэнцыя для студэнтаў і маладых вучоных «Медыяцыя як альтэрнатыўны спосаб бяспекі ў інтэрнэце», па выніках якой будзе выдадзены зборнік тэзісаў і дакладаў для электроннай бібліятэкі БДЭУ.

### Бяспечныя паводзіны і абароненыя звесткі

Ёсць розныя тыпы канфліктаў: паміж самімі вучнямі, паміж школьнікамі і настаўнікамі, навучэнцамі і бацькамі. Аднак усё часцей узнікаюць праблемы, якія выдзяляюцца ў асобную катэгорыю: канфлікты ў інтэрнэце. Так што галоўная тэма сёлетняга фестывалю — «Канфлікты ў сеціве і магчымасці медыяцыі ў іх вырашэнні» — абрана невыпадкова, бо пераважная большасць праблем, якімі разглядаюць у школах, менавіта з інтэрнэту.

— Не той фотаздымак размясціў, не так паставіў лайк, не спытаў на нешта дазвол, выставіў фота чужой банкаўскай карткі, выклаў нейкую інфармацыю з прыватнага жыцця, распачаў булінг у чатах месенджараў... Гэтыя і іншыя анлайн-праблемы і правапарушэнні, якія адбываюцца шляхам выкарыстання сеціва і чатаў, вельмі распаўсюджваюцца і пераносяцца з інтэрнэту ў рэальнае жыццё, — падзялілася Ірына Арлоўская. — І сёлета на фестывалі, калі мы адпрацоўвалі такую тэхніку медыяцыі, як «кругі згуртавання», што прымяняецца, калі ў канфлікце шмат удзельнікаў, упершыню ўвялі экспертаў Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных (НЦАПД). Кожная з пяці груп круга з дапамогай экспертаў выпрацавала свае правілы бяспечных паводзін у сеціве, якія трэба вытрымліваць. І на наступным фестывалі мы пабачым, як яны змаглі ўжываць гэтыя правілы на практыцы.

**Апроч таго, дзеці даведаліся, што такое персанальныя даныя, як трэба абараняць іх, чаму неабходна беражліва ставіцца да асабістых звестак сваякоў, сяброў і нават незнаёмцаў, якую інфармацыю трэба ўзгадняць, а якую — не.**

— Разам са школьнікамі мы разбіралі розныя выпадкі, калі могуць узнікаць рызыкі абароту персанальных даных. У прыватнасці, звесткі, змешчаныя ў TikTok, дзе збіраюцца ў тым ліку і біямет-



рычныя даныя карыстальніка: яго голас і выява, якія пасля захоўваюцца ў гэтай сацсетцы, — расказала пра ўдзел у фестывалі **Вольга ШЫБКО, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыйных паслуг і сувязяў з грамадскасцю НЦАПД.** — Вучні зацікавіліся тэмай выкарыстання і распаўсюджвання чужых персанальных даных. Яны падзяліліся сапраўднымі гісторыямі, калі нехта іншы выкарыстоўваў іх асобу як падменную і ствараў фэйкавыя акаўнты, у прыватнасці для знаёмстваў. І часам гэта заканчвалася прыцягненнем вінаватых да адказнасці.

**Адным з практычных вынікаў фестывалю сталі ролікі для TikTok па бяспечных і правільных паводзінах у сеціве, якія знялі ўдзельнікі. Цяпер з установамі адукацыі абмяркоўваецца ідэя, каб гэтыя ролікі змяшчаліся ў фае школ як наглядны дапаможнік.**

Стваральнікаў найлепшага роліка запрасілі ў НЦАПД на экскурсію, дзе ім расказалі, што робіцца для абароны персанальных даных беларусаў.



— Ад іх мы атрымалі запыт, што школьнікам неабходны дзіцячы кантэнт для прававой адукацыі дзяцей і іх бацькоў. Некаторыя падлеткі скардзіліся, што ў сацыяльных сетках іх матуль «гуляе» відэа, дзе адзін хлопец яшчэ маленькім сядзіць на гаршку, другі — без штаноў скача па лужынах. Падлеткам не вельмі прыемна, што такая інфармацыя пра іх ёсць у сеціве, — падзялілася прадстаўніца цэнтра. — На жаль, бацькі сапраўды не заўжды з разуменнем ставяцца да распаўсюджвання даных сваіх дзяцей. На сайце нашага цэнтра створаны раздзел «Дзецям аб персанальных даных», дзе мы змяшчаем карысны кантэнт для моладзі. Супрацоўніцтва, безумоўна, будзе працягвацца, ужо ёсць запрашэнні ў школы, дзе працуюць службы медыяцыі, каб расказваць дзецям пра пытанні лічбавай гігіены і кібер-бяспекі. Практыка «кругоў згуртавання» паказала, што сумесна з дзецьмі можна выпрацоўваць цікавыя рашэнні для пераадолення канфлікту і наладжваць такую нетрывіяльную вучобу.

### Намалюй сітуацыю! Папярэдзь канфлікт!

Сярод удзельнікаў фестывалю ўпершыню былі і прадстаўнікі Следчага камітэта, якія на практыцы — праз тэлефоны ўдзельнікаў — паказалі, як можна адшукаць іх уладальнікаў па інфармацыі, што яны пакінулі ў сеціве, і расказалі пра адказнасць, якая наступіць за супрацьпраўныя дзеянні.

— Пасля стасункаў са спецыялістамі юныя ўдзельнікі адправіліся крэатывіць у Майстэрню коміксаў, дзе намалявалі правілы паводзін у сеціве, якімі таксама можна падзяліцца з іншымі, — дадала намеснік дырэктара Цэнтра «Медыяцыя і права». — У карцінах яны паказалі, якія бываюць правапарушэнні, якая адказнасць настае за іх, што можа зрабіць медыятар для вырашэння канфлікту. Пры гэтым мы заўжды падкрэсліваем, што медыятар не можа замяніць сабой следчага, суддзю і іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу. Аднак медыяцыя дапамагае зменшыць эмацыянальнае напружанне паміж правапарушальнікам і ахвярай і дазваляе пацярпеламу не перайсці мяжу, за якой ён сам стане правапарушальнікам. З дапамогай медыяцыйных тэхнік правапарушальнік можа ўсвядоміць, што ён зрабіў кепска і няправільна, і сам прапануе шляхі для загладжвання прычыненай шкоды. Як мінімум, шчыра папросіць прабачэння або наладзіць стасункі ў класе так, каб ахвяру булінгу прынялі іншыя і спынілі цкаванне.

Тры найлепшыя работы-коміксы будуць удасканалены і надрукаваны ў электронным і папяровым выглядзе з дапамогай Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі, які заўжды актыўна ўдзельнічае ў фестывалі. А цяпер стане стваральнікам такога дапаможніка, які дазволіць наглядна расказваць аб праблемах і медыяцыйных шляхах іх вырашэння.

Пры гэтым адна з задач фестывалю — уключэнне ў дзейнасць медыятараў такіх тэхнік, як прафілактыка, то-бок папярэджанне жыццёвых канфліктных сітуацый і кібер-булінгу. Гэтаму арганізатары таксама ўдзяляюць пільную ўвагу, удакладніла Ірына Арлоўская:

— Такія тэхнікі добра ведаць і практыкаваць настаўнікам, якія будуць працаваць у класах, што фарміруюцца нанова. Гаворка пра пятыя і дзясятыя класы, дзе можна многія праблемы папярэдзіць і дапамагчы настроіць клас на добрыя стасункі. Мы хочам апрабаваць іх у гэтым навучальным годзе, а на наступным фестывалі — разабраць вынікі, так што наперадзе, як і раней, шмат работы.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота дадзена Цэнтрам «Медыяцыя і права».**

# «Ірына мне спадабалася з першага погляду»

*(Заканчэнне.
Пачатак
на 1-й стар. «СГ».)*

Да мяне ў Рыгу прыязджала цётка, каб дапамагчы з дзіцем, аднак ёй гэта было нялёгка, бо падводзіла здароўе. На той час мае бацькі працавалі ў Мінску ў нашым тэатры, і я прывезла ім унука. Пры першай жа магчымасці мчалася з Рыгі ў Мінск, але заўважыла, што сын мяне крыху забывае. Тады прыняла рашэнне пераехаць у Мінск — у тэатры былі вакансіі, і я паспяхова прайшла конкурс.

***— Пра вашу сустрэчу ў тэатры ходзіць легенда, многія цытуюць фразу Ірыны: «Я старэйшая, была замужам і ў мяне ёсць сын». А пры якіх абставінах яна прагучала?***

**А. З.:** Ірына мне спадабалася з першага погляду. Але ўсё не было нейкага зручнага выпадку пачаць заляцанні. І вось у тэатры капуснік, мы танцуем, я і кажу: «Выходзьце за мяне замуж». У адказ і прагучала знакамітая фраза. Мне яна спадабалася! Я зразумеў, што Ірына цудоўна іграе на сцэне, а ў жыцці вельмі шчыры чалавек і добрая мама. Выдатныя якасці для будучай жонкі! А розніца ва ўзросце, дарэчы, хутка нівеліруецца.

**І. З.:** Мне таксама Антон спадабаўся, як толькі з'явіўся ў тэатры. Дарэчы, ён паводзіў сябе як вельмі дарослы чалавек. Было нейкае разыходжанне з пашпартным узростам і яго сур'ёзнасцю, здольнасцю ўзяць на сябе адказнасць. Для мяне прапанова аказалася нечаканай. Я прыняла гэта як дадзенасць, ніякага бляску ў вачах не было.

***— Колькі часу доўжыўся перыяд заляцанняў?***

**І. З.:** Дзесьці год я прыглядалася да Антона.

**А. З.:** Як такога і не было перыяду заляцанняў, мы ж увесь час у тэатры, побач. Адносіны развіваліся вельмі натуральна.

**«Антон за кулісамі глядзеў спектаклі з маім удзелам і мог абурацца: маўляў, ужо занадта пяшчотныя паводзіны ў цыбе з партнёрам!»**

***—Ірына, да моманту ўступлення ў шлюб з Антонам вы ўжо былі вядомай актрысай, да таго ж прадстаўніцай тэатральнай сям'і. Як вырашылі перайсці на прозвішча мужа?***

**І. З.:** А гэта добрае пытанне! З-за новага прозвішча публіка «губляе» актрысу. Гэта цяпер ёсць сайт, там уся інфармацыя пра нас. А тады людзі глядзелі ў афішы, тэлефанавалі ў тэатр і ўдакладнялі, хто будзе заняты ў тым ці іншым спектаклі. Што хаваць, прыемна, калі гледачы тэлефанавалі і абураліся: «Куды падзелася Ірына Лінкевіч?» А ім адказвалі, што яна стала Заянчкоўскай. А як вырашылася? Мусіць, было прадчуванне, што наш саюз — гэта ўжо назаўжды, тады лагічна мець адно прозвішча.



Сям'я ў зборы.

**«У нас няма мэты падрыхтаваць будучых артыстаў, хоць нехта, магчыма, і выбера гэтую прафесію. Галоўнае — дапамагчы бацькам сфарміраваць усебакова развітую асобу».**

***— Ірына, як вы рыхтавалі сына Антона да таго, што ў вашым жыцці з'явіцца яшчэ адзін Антон?***

**І. З.:** Я рыхтавалася, прадумвала, што і як растлумачыць сыну. А ён ніякіх пытанняў не задаваў. Вырашыла, што яго ўсё задавальняе.

***— Ёсць такая фраза: калі кахаеш мяне, пакахаеш і маё дзіця. Як быццам дзіця — гэта дадатак да дарослага, а не самастойная асоба. Як у вас, Антон, складваліся адносіны з Антонам-малодшым?***

**А. З.:** Думаў, галоўнае, каб дзіця мяне прыняло. А я як дарослы чалавек здолею кіраваць сваімі пачуццямі і эмоцыямі. Нам пашанцавала, што Антон быў малы. Магчыма, у падлеткавым узросце такія змены ў сям'і ўспрымаюцца цяжэй. У нас усё неяк добра склалася, я лічу яго сваім сынам.

**І. З.:** — Калі Антону-малодшаму было дванаццаць гадоў, раптам патэлефанаваў яго біялагічны бацька. Кажа: «Сын, я жыву ў Амерыцы, у мяне ўсё выдатна, прыязджай». Сын адказаў, што ў яго ёсць бацька — гэта той, хто яго выгадаваў і выхаваў. Ну і калі біялагічнаму бацьку ён не быў цікавы дванаццаць гадоў, то цяпер ён не цікавы сыну. Антон гэта сказаў без усякай падрыхтоўкі, я зразумела, што ён даўно ўсё для сябе вырашыў.

***— У вас ёсць яшчэ і малодшы сын Цімафей. Як складваліся адносіны паміж хлопчыкамі?***

**А. З.:** Як у братоў. Мне здаецца, што ўсе гэтыя моманты «чыё дзіця па крыві» хвалююць у большасці дарослых, і тое не ўсіх. А дзецям галоўнае — быць любімымі і жаданымі.

***— Вашы сыны выраслі «за кулісамі»?***

**І. З.:** Старэйшы — так, а калі з'явіўся малодшы, мая мама ўжо менш была занятая ў тэатры, таму мела магчымасць дапамагаць нам.

***— Ірына, а вы колькі часу правялі ў дэкрэтных водпусках?***

**І. З.:** Па паўгода з кожным дзіцем. Лічу, што больш нельга, бо актрысу забудуць. Мне пашанцавала, бо мне дапамагалі бацькі са старэйшым сынам. А з Цімафеем увогуле не было праблем. Антон — выдатны бацька! Ён у той час працаваў і вучыўся ў Акадэміі музыкі, а, прыйшоўшы дадому, мог і пялёнкі памыць. Так, мы яшчэ карысталіся пялёнкамі, таму што памперсы былі дастаткова дарагія.

***— Сыны не пайшлі па вашым прафесійным шляху?***

**А. З.:** Мы з тых бацькоў-артыстаў, якія любяць сваю прафесію, але і ведаюць усе яе цяжкасці, таму сваім дзецям такога лёсу не жадаюць. Мы ім далі свабоду выбару.

**І. З.:** Антон абраў лінгвістычны ўніверсітэт, паспяхова паступіў, скончыў, задаволены сваёй працай.

**А. З.:** Цімафей скончыў эканамічны каледж, папрацаваў крыху па спецыяльнасці і сказаў: не маё. Скончыў курсы барбераў, набыў інструмент, працаваў і быў вельмі класным майстрам. А потым захапіўся IT, падвучыўся і цяпер працуе ў сферы высокіх тэхналогій. Гэта нармальна, калі малады чалавек сябе шукае, спрабуе на практыцы.

***— Ці вядома вам пачуццё рэўнасці?***

**І. З.:** Першы час было цяжка. Антон за кулісамі глядзеў спектаклі з маім удзелам і мог абурацца: маўляў, ужо занадта пяшчотныя паводзіны ў цыбе з партнёрам! Але ён гэта перарос. А для мяне галоўнае, каб у рэальным жыцці не было падстаў для рэўнасці.

**А. З.:** Сям'і артыстаў можа атруціць жыццё прафесійная рэўнасць. Мы яе, на шчасце, не ведаем. Наадварот, радуемся поспеху адно аднаго. Не бывае ў нас і творчых рознагалоссяў, супадаюць погляды на прачытанне той ці іншай ролі.

***— А пакрытыкаваць можаце адно аднаго?***

**І. З.:** Мусіць, можам, але імкнёмся не даходзіць да такой стадыі. У тым, што ў нас адна прафесія — вялікая перавага. Мы бачым і чуем адно аднаго з боку, і калі заўважаем шурпатасці, гаворым пра гэта, займаемся, каб добра гучаць.

***— Акрамя працы ў тэатры, вы яшчэ і педагогі. Для вас гэта дадатковы заробак ці нешта большае?***

**А. З.:** Вядома, грошы не лішнія. Для мяне важнае выкладанне ў педагагічным універсітэце яшчэ і таму, што ў самога былі выдатныя педагогі, плюс вопыт і хочацца падзяліцца гэтым са студэнтамі. У Беларусі добрыя традыцыі ў музычнай адукацыі, багатая тэатральная гісторыя, і мне хочацца прыкласці рукі да таго, каб усё гэта захавалася і развівалася. Імкнуся перааддолець нейкі нігілізм моладзі, навучыць яе бачыць свет ва ўсіх яго праявах.

**«Я зразумеў, што Ірына цудоўна іграе на сцэне, а ў жыцці вельмі шчыры чалавек і добрая мама. Выдатныя якасці для будучай жонкі!»**

**І. З.:** Мяне запрасілі паставіць спектакль з дзецьмі ў Сямейным цэнтры Наталлі Дунаевай. І неяк уцягнулася, выкладаю дзеткам акцёрскае майстэрства. У нас няма мэты падрыхтаваць будучых артыстаў, хоць нехта, магчыма, і абярэ гэтую прафесію. Галоўнае — дапамагчы бацькам сфарміраваць усебакова развітую асобу. Гэтыя дзеткі ў такім жа ўзросце, як мая ўнучка. З імі вельмі цікава, у іх адкрытыя светлыя душы. Адбываецца неверагодны абмен энергіяй: у нейкі момант здаецца, дзеці выцягнулі з цябе ўсе сокі, праходзіць хвіліна — і ты разам з імі спяваеш і танчыш.

***— У вас адна ўнучка?***

**І. З.:** Пакуль толькі Антон-малодшы падарыў унучку і ўнука. У іх розніца пяць гадоў. Унучка вельмі хацела брацiка, а калі ён з'явіўся, трошкі засмуцілася, што «ён не ходзіць і не размаўляе», але мы ёй дружна растлумачылі, што трэба крыху пачакаць. І цяпер яна дапамагае бацькам, каб брацік хутчэй вырас.

***— Як вы размяркоўваеце хатнія абавязкі?***

**І. З.:** Вельмі проста: у каго ёсць час, той і робіць.



Вяселле Ірыны і Антона.

Люблю, калі Антон гатуе — вельмі смачна!

***— А хто захавальнік сямейнай казны?***

**А. З.:** У нас такі класічны варыянт, калі муж частку грошай аддае жонцы. Усе закупкі, якія датычацца дома, плануе Ірына. Мая сфера адказнасці — аўтамабіль.

***— Калі запланавана набыццё буйной рэчы, чаму вы аддаяце перавагу: напружыцца і зарабіць або эканоміць?***

**А. З.:** Заробак артыста мала залежыць ад яго жадання. І ў тэатры, і ў зборных канцэртах склад артыстаў — гэта выбар рэжысёра. Мы не эканомім, але імкнёмся рацыянальна размяркоўваць грошы. Ірачка вельмі хацела кава-машыну. Варыянты такія: некалькі месяцаў кладзём пэўную суму ў шкатулку ці купляем тэхніку ў растэрміноўку. Выбралі апошні варыянт, вельмі зручна: ужо карыстаемся і паступова плацім. Галоўнае — не губляць галаву, калі рэклама заклікае: купляй сёння — плаці заўтра, а ацаніць свае магчымасці.

***— Як і дзе вы любіце адпачываць?***

**І. З.:** З дзяцінства люблю вандроўкі. Бацькі бралі з сабой на гастролі, і я памятаю, што да таты ўсё прыходзілі і пыталіся: што паглядзець у гэтым горадзе. У Савецкім Саюзе артысты любілі гастролі, таму што мы выязджалі ўсім тэатрам, і калі ў цябе няма спектакля, ты — турыст, які да таго ж атрымлівае сутачныя. Цяпер усё не так, мы прыязджаем толькі да свайго спектакля.

**«Прыемна, калі гледачы тэлефанавалі і абураліся: «Куды падзелася Ірына Лінкевіч?» А ім адказвалі, што яна стала Заянчкоўскай».**

Для нас адпачынак — гэта мора. Кожны год бываем у Сочы, у нас там сваякі, ёсць дзе спыніцца. Часам нам гавораць, маўляў, што гэта за адпачынак, вы там самі гатуеце, прыбіраеце. Але мы любім пазнавальны турызм, а гэта магчыма, калі ты бачыш горад не з акна аўтобуса ці шпацыруеш з экскурсаводам, а калі сам выбіраеш, куды табе ісці. Як цікава пагутарыць з людзьмі на рынку — там сапраўднае жыццё!

**А. З.:** Так, мне таксама падабаецца адпачынак, як раней казалі, «дзікуном». «Усё ўключана» для нас вельмі сумна.

Нам падабаецца, што кіраўніцтва тэатра вядзе актыўную гастрольную дзейнасць па Беларусі. Для людзей, якія жывуць у райцэнтры, аграгарадку і нават на хутары, наша мастацтва павінна быць даступна. І гэта, дарэчы, неверагодна ўдзячная публіка. Мы таксама працягваем адкрываць для сябе Беларусь, у нас ёсць столькі ўсяго цікавага: ад помнікаў архітэктуры да вытворчасцяў. Іншая справа, што мы неяк самі сябе недаацэньваем, надта сціплыя, як той казаў, саромеемся сябе паказаць. А вось прыязджайце 15 ліпеня ў Мір. Там у замку мы даём «Музычнае шоу ў стылі Сан-Рэма», паглядзіце, якая публіка, як людзі ўмеюць весяліцца, як жыве гэты пасёлак гарадскога тыпу, колькі там цікавых месцаў, кавярань, і пераканайцеся ў беларускай гасціннасці.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

*Фота з асабістага архіва сям'і Заянчкоўскіх і прэс-службы Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.*

# ДЗЕ СУСТРЭНЕШ СТАРАСЦЬ

**Каля дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў «Камфортнае жыццё», што ў Мінскім раёне, сустрэла сямейную пару. Муж з жонкай прыехалі паглядзець умовы пражывання, бо хочуць прывезці сюды сваю 95-гадовую бабулю. «Яе пакуль даглядае ў Маладзечне мая мама, якой самой ужо за 70, — распавядае жанчына. — Вось мы і вырашылі крыху разгрузіць яе. Хочам выбраць самы лепшы дом-інтэрнат, каб бабуля адчувала сябе як дома. Мы і жывём непадалёку, зможам хоць штодня яе праведваць. Цудоўна, калі б яе падсялілі да спакойнай бабулькі — усё ж удзвюх было б весялей».**



Анатоль Сцяпанавіч і Іраіда Васільеўна цудоўна адно аднаго дапаўняюць.

## Самаму маладому дзядулю — 71

Дырэктар дома-інтэрната Юлія Дударонак адразу ж згадала пра Тамару Мікалаеўну Усцінаву, якая пераехала сюды з Багатыроўкі. Бабуля вельмі сціплая, тактоўная, жыве ў двухмесным нумары, але пакуль адна. «Вой, дык яна вельмі падобная да нашай бабулі!» — узрадавалася ўнучка. Але Тамару Мікалаеўну навіна аб магчымай суседцы не надта парадавала. Сказала, што хацела б застацца ў пакоі адна.

— Пакуль ёсць свабодныя пакоі, мы можам пайсці насустрач і не падсяляць нікога. Для тых жа, хто прынцыпова хоча жыць адзін, у наяўнасці 10 аднамесных нумароў павышанай камфортнасці, але там крыху большая аплата. Сёння яна складае 37,95 рубля за суткі, у месяц атрымліваецца крыху больш за 1100 рублёў. Для параўнання: пражыванне ў двухмесным пакоі каштуе 34,2 рубля за суткі (льготны тарыф для інвалідаў 1 і 2 групы — 30,75). Калі ў бабулі ці дзядулі ёсць дзеці працаздольнага ўзросту, то за пражыванне будуць плаціць яны. У выпадку ж, калі сын ці дачка на пенсіі ці самі маюць інваліднасць, то пажылы чалавек можа пражываць у доме-інтэрнаце за сваю пенсію (незалежна ад яе памеру), ад якой яму застаецца на асабістыя расходы 10 працэнтаў.

Аднамесныя нумары павышанай камфортнасці прынцыпова адрозніваюцца ад двухмесных тым, што там ёсць тэлевізар і халадзільнік. Але пры жаданні можна прывезці і сваю тэхніку. Акрамя таго, вялікі тэлевізар знаходзіцца ў вестыбюлі на першым паверсе. Калі я прыехала, бабулі і дзядулі якраз глядзелі канцэрт.

Як высветлілася, свой другі дом у «Камфортным жыцці» знаходзяць пажылыя людзі з усёй Беларусі. Самаму «маладому» на сёння мужчыну 71 год, жанчыне — 77. Самым «дарослым» — па 88. У многіх дзеці ўжо даўно жывуць і працуюць за мяжой, ёсць і тыя, у каго спадчыннікі знаходзяцца ў псіханеўралагічных дамах-інтэрнатах ці ўжо памерлі. У некаторых бабуль і дзядуляў праблемы з нагамі, суставамі. Тых, хто не можа сам хадзіць, вывозяць на вуліцу на інваліднай калясцы. Для гэтага створаны ўсе ўмовы: пад'ёмныя платформы, панарамны ліфт.

## Пра скандынаўскую хадзьбу і малочны грыб

Пасля экскурсіі па доме-інтэрнаце ўражанні засталіся выключна станоўчыя. Утульна, светла, чыста. Такое адчуванне, што гэта не дом-інтэрнат, а санаторый-прафілакторый. Можа, яшчэ і таму, што «Камфортнае жыццё» знаходзіцца каля сасновага лесу, побач з маляўнічым возерам. Новы сучасны будынак адкрыўся ўсяго тры гады таму. Сёння ён запоўнены напалову. На момант майго прыезду было 34 «пасяленцы» з магчымых 65. Тэрыторыя дома-інтэрната агароджана, у крокавай даступнасці — садовае таварыства, куды можна схадзіць у краму. «Для гэтага трэба проста папярэдзіць вахцёра, каб мы ведалі, дзе чалавек. Наша Элеанора Фёдараўна Батвіннік, напрыклад, вельмі любіць пагуляць па садовым таварыстве».

Для жыхароў інтэрната рэгулярна ладзяцца святы, канцэрты, майстар-класы, сюды з задавальненнем прыязджаюць валанцёры з цікавымі мерапрыемствамі і падарункамі. Ёсць бібліятэка, фітабар і пакой адпачынку, дзе можна пагуляць у більярд, шашкі, шахматы. Сёлета адкрылі пакой для малітвы, закупілі палкі для скандынаўскай хадзьбы. «Ёсць у нас і кабінет фізіятэрапеўтычнага лячэння, масажная кушэтка, магніт, апараты «Сонейка» і «Біяптрон». Апошні цудоўна змагаецца з пролежнямі, але, дзякуй богу, у нашых дзядуляў і бабуль пакуль такіх праблем няма», — расказалі мне. Але самае важнае, што побач з пажылымі заўсёды знаходзіцца медработнік. Доктар на месцы з панядзелка да пятніцы з 8.30 да 17.00, медсястра і санітаркі — кругласутачна. Раз на год праводзіцца паглыбленая медагляд, сюды з Бараўлян прыязджаюць урачы. Адзенне і пасцельную бялізну рэгулярна мые персанал. Але на кожным паверсе ёсць пакойчык, дзе стаіць сучасная пральная машына і сушылка. Таму кожны пры жаданні можа сам сябе абслужыць.



Заняткі па нейрагімнастыцы пад акампанемент скрыпкі.

У пакоі павышанай камфортнасці жыве Тамара Мікалаеўна Сімуткіна, вельмі цікавая суразмоўца і аптымістка. Працавала ў Акадэміі навук, вывучала мікраэлементы. А потым здароўе стала падводзіць, здарыўся астэапароз. «Стары пратэз урачы не ўзяліся мяняць, бо косці вельмі крохкія. Вось мучаюся ўжо шмат гадоў. Але не будзем аб сумным, не хачуцца пра хваробы размаўляць».

Засялілася Тамара Мікалаеўна сюды год таму. «Дачка, ёй 56 гадоў, у трэці раз замуж выйшла, за англічаніна, хутка з'едзе жыць за мяжу, таму мяне трэба было ўладкаваць кудысьці. Я ж сама сябе ўжо абслужыць не магу. Не захацела ехаць у Ждановічы. Там 9-павярховы будынак, 500 чалавек. Тут жа лес вакол і мала людзей. Мне хацелася цішыні і спакою. Першы час, пакуль вызвалілася месца ў асобным пакоі, жыла з Ніначкай. Мы добра ладзілі. Але былі і свае нязручнасці, бо ў мяне ж накладка на ўнітаз спецыяльная... Некаторыя мае сяброўкі асуджаюць: «Вось дачка здала цябе ў інтэрнат, а яна павінна маці сваю дагледзець». Я ж лічу, што гэта старэчы эгаізм. У мяне з дачкой цудоўныя адносіны. У яе адказная работа, якая вымагае рэгулярных камандзіровак за мяжу. Не так даўно яна сустрэла цудоўнага чалавека, малю Бога, каб хоць пад старасць даў ёй шчасце. Ёсць тут адна бабуля, у якой 10 дзяцей. Дочкі ёй пастаянна цягаюць пудамі катлеты. Вось толькі не разумею, навошта. Тут жа хапае ежы, кормяць ажно чатыры разы. Мне сёння ў абед далі рыбны супчык, пюрэ, салату, дзве катлеты з пячонкі. Куды мне дзве? Адну ледзьве з'ела... Многія тэлефануюць дзецям і патрабуюць, каб прыехалі. Я ж лішні раз не турбую. У моладзі сваіх клопатаў хапае».

Тамара Мікалаеўна апошнім часам з-за хваробы не выходзіць з пакоя. Але стараецца не сумаваць. «Выпісала газету, якую прыносіць сюды паштальён, разгадваю красворды, дачка толькі паспявае прывозіць новыя зборнікі. Унук запісаў мне на дыскі фільмы, уключаю і гляджу без рэкламы. Пазнаёмілася тут з Элеанорачкай, якая апякуецца мной, калі дачка з'язджае. Тут побач ёсць крамка, дык яна купляе і прыносіць мне адтуль малако, якім я кармлю свой малочны грыб. Ён вельмі карысны. Калі хочаце, я з радасцю ім падзялюся».

## Пра туфлі-лодачкі і адзінокую гармонь

Мы размаўлялі з Тамарай Мікалаеўнай больш як гадзіну. Аж пакуль мяне не паклікалі на мерапрыемства. Так супала, што ў дзень майго прыезду праходзілі заняткі па нейрагімнастыцы і развіцці дробнай маторыкі для пажылых людзей. Гэтым разам пад жывую музыку, бо ў інтэрнат чарговы раз прыехала валанцёрка — скрыпачка Юлія.

На лесвіцы мы сустрэлі светлавалосага дзядулю з кійком. «Анатоль Сцяпанавіч, хадзем на мерапрыемства, там наша скрыпачка Юля прыехала», — запрашае дырэктар дома-інтэрната. — «Я якраз туды і іду, вось толькі па Іраіду Васільеўну зайду».

Гэтая пара ў інтэрнаце стварылася зусім нядаўна. Анатоль Сцяпанавіч Гурчанка, у мінулым малалетні вязень, жыве тут ужо год. А Іраіда Васільеўна Жыглова засялілася зусім нядаўна. Яна працавала рэжысёрам. Жанчына цудоўна выглядае, заўсёды з макіяжам, упрыгажэннямі і ў туфлі-ках-лодачках — ніколі не скажаш, што ёй за 80. Паколькі яны не муж з жонкай, то жывуць у асобных пакоях. Любяць разам прагульвацца за ручку. «Мы шчаслівыя, што яны пасябравалі, — кажуць супрацоўнікі дома-інтэрната. — Яны адно аднаго цудоўна дапаўняюць».



«Тамара Мікалаеўна Усцінава ў нас вельмі гасцінная. Пастаянна ўсіх на чай запрашае», — усміхаецца медсястра Валянціна Сцяпухіна, якая зайшла спытаца ў бабулі пра самаадчуванне.

Пасля нейрагімнастыкі адзін дзядуля папрасіў, каб скрыпачка выканала яго любімую песню «Валёнкі». Юлія паабяцала падрыхтавацца і наступным разам зладзіць канцэрт па заяўках. «Што б яшчэ хто хацеў пачуць?» — запыталася яна ў бабуль і дзядуль. «Што-небудзь з рэпертуару Тарывердзіева, з фільма «17 імгненняў вясны». «А я люблю «Малодушкі-малодкі» Бабкінай». Ніхто з прысутных не ведаў такой песні... І бабуля, якая, як потым высветлілася, была ў свой час «залатым голасам» Заслаўя, зацягнула «Молодушки-молодки, зелёные ростки // Наш бабий век короткий, и ночи коротки...» «Дык у вас талент, будзеце мне дапамагаць ладзіць канцэрт. А вы якую песню замаўляеце?» — цікавіцца Юлія ва ўсмешлівага дзядулі. «А я ўжо нічога не памятаю». — «А яму запішыце «Что-то с памятью моей стало», — жартуе яго сябра. Пасля гэтых слоў усе смяюцца ад душы і, здаецца, маладзеюць на вачах.

Пасля нейрагімнастыкі мне захацелася бліжэй пазнаёміцца з «залатым голасам» Заслаўя. Разам з дырэктарам дома-інтэрната падыходзім да дзвярэй пакоя, адкуль даносіцца «Клён кудрявый...» Галіна Андрэеўна Туманава сядзела на ложку з баянам і спявала. Было відаць, што яна зусім не чакала нас убачыць. Галіна Андрэеўна з навічкоў. Трапіла ў інтэрнат зусім нядаўна. Кажа, жыла на пятым паверсе ў Заслаўі. Калі спускалася на вуліцу, звалілася з лесвіцы. «Прыехала сюды, калені былі чорныя як вугаль. Добра, што галавой яшчэ аб сцяну не ўдарылася — так ляцела. Дачка перапужалася і адразу ж пачала афармляць мяне сюды. Яна ў Літве жыве з сям'ёй. А я тут — «адзінокая гармонь». Сустаў мне трэба мяняць, стаю на чарзе больш як 4-тысячная...»

— У нас ёсць бабуля, якая зусім нічога не бачыць і не чуе. Дык яна заўсёды дзякуе і просіць усім здароўя. Даеш ёй есці — яна рукі цалуе. Можаце ўявіць, якой добрай душы чалавек, — распавядае медсястра Валянціна Сцяпухіна. — Усе бабулі і дзядулі ў нас добрыя. Проста пакрыўджаныя крыху жыццём: так атрымалася, што ў іх складаныя лёсы.

— Бабулям і дзядулям цяжкавата першы час, а потым прывыкаюць і не хочуць з'язджаць, — кажа дырэктар. — Вунь, бачыце, на лавачцы сядзіць мужчына. У яго некалькі гадоў таму памерла жонка. І дзеці прывезлі яго да нас. Яны жывуць тут непадалёку. Прыязджаюць, праведваюць, на выхадныя часта забіраюць, на святы... Дык ён пабудзе там крыху і кажа: «Вязіце мяне ўжо дамоў». Ці дзядуля з Заслаўя, які паступаў да нас з бальніцы, пасля інсульту. Ляжачы быў, не хадзіў. А мы яго выхадзілі, цяпер жыве на трэцім паверсе, тупае сам без кійка. Жартаўнік такі, якіх пашукаць. У яго два сыны: адзін — у Расіі, другі — у Заслаўі. Але яму так у нас падабаецца, што не хоча да сына пераязджаць. Тым больш што кожны жыхар можа ўзяць водпуск у суме на тры месяцы ў год і паехаць да сваіх сваякоў пагасцяваць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара.**

*Больш фотаздымкаў глядзіце на сайце «Звязды».*

## Дарэчы

### Дзіцячы сад для бабуль і дзядуляў

У доме-інтэрнаце «Камфортнае жыццё» ёсць паслуга дзённага знаходжання для пажылых людзей. «Калі чалавек працуе, ён можа адвезці маму ці тату зранку да нас, а вечарам пасля працы забраць, каб не перажываць, што стары чалавек застаўся адзін дома, — распавядае дырэктар дзяржаўнай установы Юлія Дударонак. — Бабулі і дзядулі могуць знаходзіцца пад наглядам спецыялістаў да 12 гадзін у суткі днём. Гэтая паслуга бясплатная, плаціць трэба толькі за харчаванне».

# «ДВАЙНОЕ» ЖЫЦЦЁ

## Калі вам здаецца, што ў вашага мужа ёсць другая сям'я — магчыма, вам гэта не здаецца...

**Здараецца, рамантычныя адносіны жанатага мужчыны перарастаюць у другую сям'ю — такая сітуацыя звычайна абумоўлена шматгадовай эмацыянальнай сувяззю з іншай жанчынай, якая важная, дарагая і блізкая. Але і «першы», узаконены шлюбны саюз «мужу дзвюх жонак» таксама важна захаваць. Прычын можа быць мноства: напрыклад, любоў да сваіх дзяцей, або эмацыянальная прыхільнасць да жонкі, або агульны бізнес з яе татам... Чаму мужчыны часам усё жыццё жывуць «на дзве сям'і», а жанчыны заплюшчваюць на гэта вочы, мы спыталі ва ўдзельнікаў такіх «трохкутнікаў», а таксама ў псіхолага.**

### ПРАВІЛЫ ДЗЯЛЕННЯ (ЖАНОЧЫ ПОГЛЯД)

Вы ўпэўнены, што «ніколі не будзеце дзяліць каханага з іншай»? Ой, не заракайцеся, перасцерагае мая суразмоўніца Марына.

— Пазнаёміліся мы на навагоднім карпаратыве. Ён працаваў у іншым аддзеле нашага вялікага прадпрыемства, і я не раз звяртала на яго ўвагу, але не было падставы загаварыць. А тут ён сам падышоў да мяне. Пачуцці ўспыхнулі імгненна. Гэтаму спрыяла і атмасфера чараўніцтва, бо перад Новым годам заўсёды верыш у цуд. Я адразу здагадалася, што ён жанаты, а ён сказаў мне пра гэта на трэцім спатканні. І я вырашыла заплюшчыць на гэта вочы. Я не «драпежніца» і не амаральная жанчына, але мне было ўжо за 35 і я марыла пра каханне. А нашы пачуцці былі такія моцныя, што мы абодва хутка здаліся і пачалі сустракацца. У яго нядаўна нарадзілася трэцяе дзіця, і, зразумела, пакінуць сям'ю ён не мог з маральных меркаванняў. Некалькі разоў збіраўся сказаць жонцы, што пакахаў іншую, але кожны раз нешта перашкаджала: ці то хварэла дзіця, ці то ў яго жонкі памерла мама... Так прайшло 8 гадоў. Мне здаецца, яго жонка ведала пра маё існаванне, але палічыла за лепшае пакінуць усё як ёсць. За гэтыя гады неаднойчы я спрабавала сысці ад яго, бо мая маладосць «выцякала скрозь пальцы», а сапраўдную сям'ю я не будавала. Калі ў нас нарадзілася дачка, я паставіла ўльтыматум: або я, або ягоная жонка — і перапыніла стасункі з Сяргеем на некалькі месяцаў. Але адной гадаваць дзіця вельмі няпроста, тым больш што Сярожа вельмі прывязаны да нашай малой, дапамагае матэрыяльна і бавіць з дачкой час. Але ўсе святы і выхадныя мы з ёй адны... Год таму быццам бы вырашылі, што ён сыдзе з сям'і і мы пажэнімся, але сур'ёзна захварэла яго жонка — і ён зноў застаўся там...

> **«Калі сыну споўніўся год, жонка сказала: «Я ведаю пра тваю палюбоўніцу. Калі хочаш — сыходзь, утрымліваць цябе не буду».**

А вось Софія апынулася ў адваротнай сітуацыі: яна — «старэйшая» жонка Аляксея.

— Муж для мяне заўсёды быў сімвалам сапраўднага мужчыны. Моцны, высокі, шыракаплечы, разумны, смелы, залатыя рукі — дома ўсё робіць, прафесіянал сваёй справы, на працы яго цэняць. Ён заўсёды марыў мець шмат дзяцей, вялікую сям'ю. Але здарылася так, што ў мяне не можа быць дзяцей. А ўсынаўленне, сказаў муж, не для яго, бо сыны і дочкі павінны быць яго працягам... Калі высветлілася, што мне ніколі не стаць маці, я хацела скасаваць шлюб, але муж сказаў, што кахае мяне, не можа без мяне і мы пераадолеем гэта разам. Дзесяць гадоў я пражыла ў бясхмарным шчасці. Напэўна, таму ні пра што не здагадвалася — верыла Алёшу безумоўна. Пакуль аднойчы муж не распавёў мне (мы яшчэ перад вяселлем дамовіліся, што будзем сумленныя адзін з адным), што ў яго ёсць іншая жанчына і яна цяжарная. Тады я з'ехала да мамы, у іншы горад. Але без каханага два тыдні не знаходзіла сабе месца. А потым даведалася, што, калі з'ехала, муж трапіў у бальніцу з сардэчным прыступам. Вядома, я вярнулася. І ў рэшце рэшт вырашыла... пазнаёміцца з маці яго дзіцяці, Веранікай. Нечакана... яна мне спадабалася. Зусім маладзенькая дзяўчына расчуліла мяне да слёз. Яна сказала, што ведае, якое месца я займаю ў Лёшавым сэрцы, і разумее, што ніколі ён не сыдзе ад мяне да яе. Але рашылася нарадзіць ад яго, таму што, як і я, вельмі любіць яго. Цяпер іх сыну Данілу чатыры гады. Зразумела, яму патрэбен бацька — і Аляксей часта бывае ў той сям'і. А я змірылася з сітуацыяй. Нават згаджаюся часам, каб Данік прыходзіў да нас у госці, перадаю яму падарункі для дня нараджэння. Вядома, знаёмыя пра гэту сітуацыю нічога не ведаюць: Мінск вялікі, у маленькім гарадку схаваць такое было б складаней. Я ведаю, многія мяне асудзяць. Але гэта — маё рашэнне. Праўда, колькі яшчэ вытрымаю дзяліць яго з іншай, не ведаю. Я не ў сілах разарваць адносіны, але часам бывае вельмі цяжка мірыцца з прысутнасцю Веранікі ў нашым жыцці. Тым больш што яна зноў цяжарная...

### НА ДВА ФРОНТЫ (МУЖЧЫНСКІ ПОГЛЯД)

А вось гісторыя Ігара, які ўжо шмат гадоў жыве «на дзве сям'і»:

— Калі я пазнаёміўся з Дашай, з Алай мы ўжо шмат гадоў жылі ў моцным, добрым шлюбе. Але калі дачка паступіла ў ВНУ і з'ехала, я чамусьці адчуў, што жыццё праходзіць міма... З намі застаўся малодшы сын, але і ён быў ужо старшакласнікам і не меў такой патрэбы ў бацькоўскай апецы, як тады, калі быў маленькі. З Алай мы пажаніліся вельмі маладымі, нам было па 18, і ўсё жыццё я імкнуўся забяспечыць сям'ю. Мы абодва шмат працавалі, не думалі пра сябе. Потым быццам бы ўсё наладзілася, мой бізнес стаў паспяховы, а даход стабільны, толькі радасці чамусьці не было. Даша паказала мне зусім іншае жыццё: што можна радавацца, праводзіць выхадныя разам, размаўляць ночы напралёт, адпачываць, весяліцца, ездзіць кудысьці... Яна стала для мяне святам, другой маладосцю. Я спачатку быў упэўнены: усё гэта часова. Потым стаў задумвацца пра развод, але ўвесь час нешта перашкаджала: спачатку ў жонкі адзін за адным памерлі бацькі, і для яе гэта стала страшным ударам. Потым аказалася, што яна цяжарная. Трэцяе дзіця. Я ведаю, для чаго яна ўпотай перастала прымаць супрацьзачаткавыя прэпараты — каб утрымаць мяне. І я не змог сысці. Кажуць, праблемы не ходзяць у адзіночку — неўзабаве станоўчы тэст на цяжарнасць паказала мне і Даша. І я аказаўся перад выбарам, зрабіць які ой як няпроста. Наша з Алай позняе дзіця нарадзілася з сур'ёзным захворваннем. Спатрэбіліся і грошы, і дапамога жонцы. Наша з Дашай дачушка — вясёлае і здаровае дзіця. Лёгкім характарам і ўменнем рабіць жыццё святам яна падобна да сваёй мамы... Калі сыну споўніўся год, жонка сказала: «Я ведаю пра тваю палюбоўніцу. Калі хочаш — сыходзь, утрымліваць цябе не буду. Галоўнае — дапамагай, бо адной мне малодшага не падняць. І я вырашыў: пакіну ўсё як ёсць. Усіх «падыму», усіх забяспечу, бо я мужчына і бацька... Так і жывём. Дзеці ў абедзвюх сем'ях не ведаюць пра існаванне іншай сям'і. Хоць старэйшыя, напэўна, здагадваюцца...



> **«Я адразу здагадалася, што ён жанаты, а ён сказаў мне пра гэта на трэцім спатканні. І я вырашыла заплюшчыць на гэта вочы».**

### УЛАДАР ПРЫЗНАЧЫЎ МЯНЕ ЛЮБІМАЙ ЖОНКАЙ

Любоўны трохкутнік — гэта гісторыя аб праблемах «родам з дзяцінства», аб бацькоўскай сям'і, лічаць псіхолагі. У чалавека, здольнага быць верным у каханні, перш за ўсё павінен быць «бэкграўнд», звязаны з выхаваннем. Калі ў бацькоўскай сям'і высокая каштоўнасць партнёрства, калі паміж мамай і татам ёсць давер і вернасць, дзіця атрымлівае падмурак, на якім у далейшым выбудуе ўласную сістэму каштоўнасцяў. Але давайце паглядзім праўдзе ў вочы: каля паловы сем'яў у нашай краіне перажываюць развод. І такая сітуацыя — не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах. Як вынік — дзіцяці няма дзе назіраць за адносінамі любові і даверу. Словам, жыццё на дзве сям'і «праграмуецца» з дзяцінства. А тут яшчэ і ўплыў масмедыя. Ці шмат у апошнія дзесяцігоддзі было знята кіно і серыялаў, дзе апяваецца вернасць і адзінае на ўсё жыццё каханне? Мужчынам так доўга паўтаралі, што яны палігамныя, што для многіх глыбока ў падсвядомасці засела: «прагулкі налева» — важнае пацвярджэнне іх мужнасці.

— Калі чалавек з дзяцінства назірае псіхалагічную дыстанцыю, а часам і сцяну неразумення паміж маці і бацькам, калі ён не ведае, што такое духоўная блізкасць, таму што ніколі такога не бачыў, калі адносіны паміж бацькамі разбураюцца на вачах з-за любоўнага трохкутніка, тады, пасталеўшы, хутчэй за ўсё паўторыць падобную сітуацыю ў сваёй сям'і, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — Для гэтага ён падсвядома шукае патрэбнага партнёра і знаходзіць яго беспамылкова — таго, хто бліскуча зможа выканаць сваю ролю «аднаго з кутоў любоўнага трохкутніка».

> **«Я ведаю, многія мяне асудзяць. Але гэта — маё рашэнне. Праўда, колькі яшчэ вытрымаю дзяліць яго з іншай, не ведаю».**

Трохкутнік, напэўна, — самая ўстойлівая геаметрычная форма. Звычайна дзве сям'і ўраўнаважваюць адна адну, адзначаюць псіхолагі. Дапусцім, з першай, «старэйшай», жонкай мужчына атрымлівае падтрымку, камфорт, утульнасць, разуменне, іх звязваюць агульныя ўспаміны. А «малодшая» жонка дорыць надзвычайнае фізічнае задавальненне і адчуванне лёгкасці, маладосці. Тым больш што такая сітуацыя працуе на мужчынскае самалюбства: ён на вяршыні трохкутніка, а каля падножжа гэтай «фігуры» за яго змагаюцца дзве жанчыны.

— Зрэшты, нельга сказаць, што сітуацыя жыцця «на дзве сям'і» бясхмарная і для мужчыны. Ён адчувае пастаянны стрэс і пакуты сумлення, лічыць сябе здраднікам і ў першай сям'і, і ў другой, павінен дзяліць свой час і даходы. Гэта прыводзіць да выгарання, а нешта змяніць, прыняць нейкае радыкальнае рашэнне мужчыну з кожным годам становіцца ўсё больш складана, — падкрэслівае суразмоўніца.

Тым больш, кажуць псіхолагі, што захаваць шлюб людзям часта дазваляе менавіта «другая сям'я» — без яе, магчыма, «першы» саюз даўно б распаўся. А другая жонка становіцца свайго роду псіхатэрапеўтам. Сама таго не жадаючы, яна падтрымлівае сям'ю, з якой хацела б звесці каханага, умацоўвае шлюб свайго мужчыны, паколькі бярэ на сябе частку функцый жонкі. Калі б у мужчыны не было «другой сям'і», яму давялося б паглядзець на сваё «першае» партнёрства адкрыта і прама. Убачыць, што ў ім больш няма даверу, кахання, блізкасці, і задумацца, ці трэба гэтыя адносіны захоўваць. Але пачуццё віны — вельмі трывалы «клей», які герметычна і надоўга «заляпляе» любыя расколіны ў адносінах.

> **«Яна сказала, што ведае, якое месца я займаю ў Лёшавым сэрцы, і разумее, што ніколі ён не сыдзе ад мяне да яе. Але рашылася нарадзіць ад яго».**

### НА ПЕРШЫ-ДРУГІ РАЗЛІЧЫСЯ!

Якая ж сям'я «першая», а якая — «другая»? Пытанне не першараднае, але вельмі важнае для жаночай паловы трохкутніка. Звычайна гэта заўсёды можна сказаць дакладна, адзначае Кацярына Алёхіна. Неабавязкова «першай» становіцца сям'я, створаная раней за «другую», бывае і наадварот. Але «першай» заўсёды становіцца сям'я «для жыцця», тады як «другая» бярэ на сябе ролю псіхалагічнай разгрузкі.

— Вельмі часта такое здараецца, калі адны з адносін будуюцца па схеме «мама — сын», — тлумачыць Кацярына Анатольеўна. — Падсвядома мужчына бачыць у жанчыне правобраз маці. І сям'я з гэтай жанчынай становіцца «першай», «для жыцця». Тут ён «станоўчы», тут ён «добры сем'янін». У «другой сям'і» гэты мужчына — зусім іншы чалавек: да той, іншай жанчыны ён прыходзіць, каб адчуць сябе «крутым мача». Пры гэтым секс прысутнічае ў абедзвюх сем'ях, хоць ён істотна адрозніваецца сваёй эмацыянальнай афарбоўкай.

> **«Неабавязкова "першай" становіцца сям'я, створаная раней за "другую", бывае і наадварот».**

Ці можна адчуваць сябе шчаслівым, стаўшы часткай гэтай геаметрычнай фігуры? Звычайна не. Але людзі часам жывуць так гадамі, і іх псіхіка прыстасоўваецца да дыскамфорту. Яны вучацца заплюшчваць вочы на свае пачуцці, не перажываць, забываць.

— Справа тут нават не ў самім жыцці на дзве сям'і, на якое згаджаюцца ўсе ўдзельнікі гэтай няпростай сітуацыі, — кажа сямейны псіхолаг. — Справа ў тым, чаму яны ўсе на гэта падсвядома згодныя. Праблема — у няўменні будаваць блізкія адносіны, заснаваныя на даверы і каханні. Або ў падсвядомым страху пусціць кагосьці занадта блізка, які прымушае выбудоўваць псіхалагічныя бар'еры. Або ў няздольнасці да кахання без таго, каб «растварацца ў каханым». Вось менавіта над гэтым і трэба працаваць. Толькі прапрацаваўшы гэтыя праблемы, такую неверагодна складаную сітуацыю ў вас атрымаецца вырашыць найбольш рацыянальна і выйсці з яе з найменшымі стратамі.

**Дзіяна РОНІНА.**

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон +375 17 283 15 10

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2023 года

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 271 798 | 162 942 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 3.2 | 907 | 734 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.3 | 89 826 | 172 187 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.4 | 224 897 | 227 938 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.5 | 71 077 | 55 457 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.6 | 415 780 | 320 049 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.7 | 2 | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.8 | 23 161 | 21 260 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 3.9 | - | 1 250 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3.10 | 3 112 | 3 161 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 3.11 | 27 | 33 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3.12 | 8 393 | 4 699 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **1 108 980** | **969 712** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 3.13 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 3.14 | 3 961 | 6 693 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 3.15 | 878 482 | 752 980 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3.16 | 7 366 | 14 612 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 92 | 18 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3.17 | 21 024 | 15 869 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **910 925** | **790 172** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3.18 | 4 630 | 11 463 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 19 132 | 9 632 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.19 | 16 262 | 16 021 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.20 | 158 031 | 142 424 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **198 055** | **179 540** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **1 108 980** | **969 712** |

Форма 2

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2023 г.

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 22 563 | 22 283 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 7 104 | 10 622 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **15 459** | **11 661** |
| | | | | | |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 29 030 | 20 392 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 12 910 | 8 787 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **16 120** | **11 605** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 173 | 444 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | (222) | (348) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 38 888 | 61 113 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | (92) | (127) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 6 924 | 1 768 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 825 | 526 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 29 995 | 26 073 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 1 143 | 1 199 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 33 089 | 55 834 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 8 006 | 13 441 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **25 083** | **42 393** |

**Председатель Правления** **Д.Ю. Грузицкий**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

**Дата подписания: 04 июля 2023 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта
**https://tb.by/about/bank/finance**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 17.03.2023 г.
УНП 100706562

**Организатор электронных торгов:** Дукорский сельский исполнительный комитет, 222840, Минская область, Пуховичский район, Дукорский сельсовет, аг. Дукора, ул. Речная, д. 14, +375 1713 63935, +375 1713 99436, +375 29 2424313

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 14.08.2023** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by. **Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Дукора, ул. Червякова, 73А, 624483402101001702 | 0,15 | сети электроснабжения, газоснабжения | 16 000,00 | 1 600,00 | 1 722,36 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 2 | д. Станиславово, уч. 1, 624483402101001709 | 0,084 | сети электроснабжения, газоснабжения | 3 000,00 | 300,00 | 1 759,10 +стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 3 | д. Мостовая, переулок Дачный, 3, 624483404101000124 | 0,15 | сети электроснабжения | 6 000,00 | 600,00 | 1 914,32 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

Продавец: Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская область, Пуховичский район, агрогородок Дукора, ул. Речная, д.14; +375 1713 63935; +375 1713 31636; +375 1713 31622, dukorselisp@pukhovichi.gov.by.

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 09.08.2023 до 15.00.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах.

**Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества

| № лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание – цех по производству блоков, инв. № 640/С-15078. Назначение – 2 25 05 – здание специализированное для производства строительных материалов. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/1. Общ. пл.: 1727,9 кв. м. Год постройки – 1991. Составные части: 1. Здание склада; 2. Здание туалета; 3. Здание УДИМ; 4. Забор ж/б – 157,4 м п.; 5. Навес<br>Здание – АБК с мастерской, инв. № 640/С-27985. Назначение – здание специализированное иного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пл.: 762,0 кв. м. Год постройки – 1994<br>Здание – артскважина, инв. № 640/С-27993. Назначение – здание специализированное иного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/3. Общ. пл.: 21,7 кв. м. Год постройки – 1995<br>Сооружение – водонапорная башня, инв. № 640/С-113484. Назначение – 3 09 00 – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/2. Общ. пл.: 6,6 кв. м. Год постройки – 1996<br>Сооружение – внутриплощадочные сети водопровода, инв. № 640/С-113745. Назначение – 3 09 00 – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Адрес: Минская обл.,Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пр.: 110,4 м п. Год постройки – 1991<br>Сооружение – площадка асфальтобетонная, инв. № 640/С-113744. Назначение – 3 99 99 – сооружение неустановленного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пл.: 5862,0 кв. м. Год постройки – 1991 | **442 320,00** | **22 116,00** | **22 116,00** |
| | Вышеуказанные здания и сооружения расположены на земельном участке площадью 2,3869 га с кадастровым номером 624650100001009734, расположенном по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания зданий и сооружений производственного цеха. Право аренды | | | |
